ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАЮ, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

ЗЬВЯЗДА

Орган Цэнтральнага Камітэту Камуністычнае партыі (бальшавікоў) Беларусі і Менскага АК КП(б)Б

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ (з дарожным дадаткам „Прафрух")
На 1 мес. . . — 80 к.
„ 3 мес. . . 2 р. 60 к.
„ 6 мес. . . 5 р. —
„ 12 мес. . . 9 р. 75 к.

За радок нонп. пасьля тэксту—50 к. Іншагароднія абвесткі—1 р. за радок. Пасярод тэксту—у два разы дарожэй. Пры шматразовым друкаваньні—скідка. Зьмыш тарыфу, згодна пастановы СНК ад 10-IX—24 г. бярэцца 10 проц. ад-гаку.

Падпіска і абвесткі прымаюцца ў гал. канторы газ. „Зьвязда" Менск, Савецкая, 63, 3-ці паверх, тэл. 7-81.

ТЭЛЕФОНЫ:
Рэдактар . . . 10-74
Сакратар . . . 6-19
Партсэкратар . . . 13-80
Сэкцыя інфармацыі . 13-80
Начны рэдактар . . 6-42
Галоўная кантора . 7-81
Аддзел падпіскі . 7-81
„ абвестак . . 7-81

НЯДЗЕЛЯ, 3 ЖНІЎНЯ 1930 г.
№ 179 (3777)
Год выданьня—XIV.

РЭДАКЦЫЯ І ГАЛОЎНАЯ КАНТОРА МЕНСК, Савецкая, 63.

За бальшавіцкія тэмпы беларусізацыі!

Характарызуючы сутнасьць ухілу да вялікадзяржаўнага шавінізму, які, як гэта адзначыў XVI зьезд УсесКП(б), ажыцьцяўляецца галоўнай небясьпекай на цяперашнім этапе, тав. Сталін сярод іншых характарных рысаў гэтага ўхілу адзначыў, што ўхілістыя гэтага тыпу імкнуцца абыйсьці нацыянальныя адрозьненьні мовы, культуры, быту. Тут Сталін казаў, што вялікарасійскія ўхілісты, выходзячы з таго, што яны перамозе сацыялізму, нацыі павінны зьліцца ў адно, а іх нацыянальныя мовы павінны ператварыцца ў адзіную агульную мову, абараняюць погляд аб тым, што быццам ужо «прыйшла пара да таго, каб ліквідаваць нацыянальныя адрозьненьні і адмовіцца ад палітыкі падтрыманьня разьвіцьця нацыянальнай культуры раней прыгнечаных народаў». Такая тэорыя, «тэорыя адмаўленьня нацыянальных моваў і зьліцьця іх у адну агульную мову ў рамках **аднае** дзяржавы ў перыяд разгорнутага сацыялістычнага будаўніцтва, у перыяд сацыялізму ў **адным** краі, ёсьць тэорыя няправільная, антымаркасцкая, антыленінская».

Ухілістыя ў бок вялікадзяржаўнага шавінізму, прапаведуючы тэорыі адмаўленьня нацыянальных моваў, ужо нанер становяцца на пазыцыі барацьбы супроць ленінскай нацыянальнай палітыкі, супроць разгортваньня і будаўніцтва нацыянальных па форме і сацыялістычных па зьмесьце культур на ўмовах дыктатуры пралетарыяту. Тав. Сталін на зьезьдзе падкрэсьліваў: ...«Ленін ніколі не гаварыў, што нацыянальныя адрозьненьні павінны зьліквідаваць, а нацыянальныя мовы павінны зьліцца ў адну агульную мову ў межах **аднае** дзяржавы, **да перамогі** сацыялізму **ў сусьветным маштабе**»... Вялікадзяржаўныя шавіністы не разумеюць дыялектычнасьці ў ленінскай пастаноўцы пытаньня аб нацыянальнай культуры і нацыянальных мовах.—«Росквіт нацыянальных па форме і сацыялістычных па зьмесьце культур на ўмовах дыктатуры пралетарыяту ў адным краі **для** зьліцьця іх у адну супольную сацыялістычную (і па форме і па зьмесьце) культуру з адной супольнай мовай, калі пралетарыят пераможа ва ўсім сьвеце і сацыялізм увойдзе ў быт»—у гэтым іменна і заключаецца дыялектычнасьць ленінскай пастаноўкі пытаньня аб нацыянальнай культуры»—кажа тав. Сталін у дакладзе на XVI зьезьдзе УсесКП(б).

Зусім відавочна, што ўхілістыя ў радох партыі, якія імкнуцца ліквідаваць нацыянальныя рэспублікі і вобласьці, якія імкнуцца сарваць палітыку партыі па нацыяналізацыі апарату, прэсы, школы і іншых арганізацый, скочваюцца па сутнасьці на пазыцыі рэакцыйнага вялікарасійскага шавінізму. У сваёй барацьбе супроць нацыянальнай палітыкі партыі яны абвіваюць пацёк капіталістычных элементаў гораду і вёскі, якія супраціўляюцца разгорнутаму сацыялістычнаму наступленьню.

У рашучым і непрымірымым змаганьні з усімі гэтымі антыпартыйнымі тэорыямі і ўстаноўкамі, партыя наша пераможна кіруе нацыянальна-культурным будаўніцтвам, сацыялістычным будаўніцтвам нацыянальных рэспублік. У ВССР, дзякуючы правільнай нацыянальнай палітыцы, якую ажыцьцяўляе наша партыя пад кіраўніцтвам ЦК КП(б)Б, мы маем буйныя дасягненьні ў абсягу будаўніцтва беларускае пралетарскае культуры і культуры нацыянальных меншасьцяй, у галіне ажыцьцяўленьня беларусізацыі. Наперакор расійскаму, беларускаму, яўрэйскаму, польскаму і інш. шавінізмам, у бязьлітаснай барацьбе супроць іх, КП(б)Б крок за крокам ператварае ў жыцьцё, на практыцы ленінскія прынцыпы нацыянальнай палітыкі. Толькі клясавы вораг і яго нацыяналістычная, апартуністычная агентура ў радох партыі могуць адмаўляць бясспрэчныя факты дасягненьняў, якія няўхільна вядуць да ліквідацыі рэштак фактычнае нацыянальнае няроўнасьці. Няма патрэбы доўга даводзіць, што на падставе правільнай нацыянальнай палітыкі, ажыцьцяўленьне якой праходзіла і праходзіць у абстаноўцы абвостранай клясавай барацьбы, кожнае наша дасягненьне рашуча б'е па капіталістычных элемэнтах гораду і вёскі і іх нацыяналістычных ідэалёгах.

Але зусім зразумела, што антыпартыйныя і антыленінскія тэорыі, аб якіх мы гаварылі ў пачатку артыкулу, знаходзяць сваё канкрэтнае выражэньне ў барацьбе вялікадзяржаўнага шавінізму за зрыў нашай нацыянальнай палітыкі, супроць беларусізацыі, супроць будаўніцтва нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце культуры. Робяцца спробы падвесьці пад барацьбу супроць палітыкі партыі ў галіне беларусізацыі ўсялякія тэорыі за «левай» формай якіх захоўваецца рэакцыйны твар махравага вялікарасійскага шавіністага. Як і ва ўсёй барацьбе супроць нашай нацыянальнай палітыкі, так і канкрэтна, у барацьбе супроць беларусізацыі, расійскі, яўрэйскі, польскі і іншыя шавіністыя выступаюць у цесным і нераздрыўным саюзе з беларускімі нацыянал-дэмакратамі. Дасягненьні ў галіне беларусізацыі гэта руйнуючы ўдар па ўсіх антыленінскіх тэорыях і ўстаноўках вялікадзяржаўных шавіністых. Беларусізацыя, якая праводзіцца пад кіраўніцтвам рабочае клясы і яе кампартыі, гэта адначасова і руйнуючыя ўдары па беларускім нацыянал-дэмакратызьме і яго нацыянал-апартуністычнай агентуры ў радох партыі.

Цьвёрда ажыцьцяўляючы нацыянальную палітыку нашай партыі мы павінны з усёй сілай ударыць па тых недахопах, якія ёсьць у ажыцьцяўленьні задач у справе беларусізацыі. Мы павінны з усёй сілай ударыць па тых, хто зрывае беларусізацыю, па тых, хто сабатіруе яе, па тых, хто сваёй пасыўнасьцю ў ажыцьцяўленьні пастаноў партыі на беларусізацыі па справе ставіць палкі ў калёсы нацыянальнай палітыкі партыі.

Сёньня мы друкуем канкрэтныя матар'ялы, якія дадзены нам абсьледваньнем беларусізацыі ў многіх установах, абсьледваньнем, праведзеным «Зьвяздой» і Фрунзаўскім РК КП(б)Б. Гэтыя канкрэтныя матар'ялы сыгналізуюць нам, што мы маем у галіне беларусізацыі рад паасобных прарываў і паважных недахопаў. Аб чым гавораць гэтыя канкрэтныя матар'ялы і факты? Перш за ўсё кідаюцца ў вочы з боку паасобных камуністых і паасобных зьвеньняў савецкага і прафэсыянальнага апарату **ФАРМАЛЬНЫЯ адносіны** да выкананьня пастаноў партыі ў справе ажыцьцяўленьня беларусізацыі. Калі даволі рэдка прыходзіцца адзначаць факты **адкрытых** выступленьняў супроць беларусізацыі, дык мы маем на практыцы **ня менш небясьпечнае зьявішча**, якое выяўляецца ў **пасыўным супраціўленьні беларусізацыі.** На словах прымаюцца ўсе пастановы, а на справе ня робіцца нічога для ажыцьцяўленьня яе.

Зусім трывожным зьяўляюцца факты, якія гавораць аб ганебна-невыстарчальнай рабоце ў галіне беларусізацыі, якую праводзяць паасобныя рабочыя клюбы, бібліятэкі і культурна-асьветныя арганізацыі. 150 беларускіх кніжак на 10.000 кніг у бібліятэцы мэталістых, гэта факт, які можа і павінен прыкаваць да сябе ўвагу з боку ЦСПСБ, Наркамасьветы і іншых арганізацый. Трэба прызнаць, што культурна-асьветныя ўстановы прафсаюзаў не мабілізаваны для сапраўднага ажыцьцяўленьня, не на словах, а на справе, пастаноў партыі аб беларусізацыі.

Адным з найбольш сур'ёзных недахопаў зьяўляецца **слабасьць**, а мясцамі і зусім **поўная адсутнасьць праверкі выкананьня** дырэктыў партыі аб беларусізацыі. І на лініі прафсаюзнага апарату, і па лініі савецкага апарату (гл. матар'ялы аб ВСНГБ) не наладжана і не праводзіцца праверка партыйных пастаноў па беларусізацыі. ЦСПСБ пачаў праверку, але... ня скончыў яе і не давёў да канца.

Цэнтральнай і галоўнай задачай, якая зараз стаіць перад намі—гэта ўзяцца пабаявому, пабальшавіцку **за праверку правядзеньня ў жыцьцё ўсіх пастаноў партыі і ўлады па пытаньнях беларусізацыі.** Апошняя пастанова ЦК КП(б)Б аб беларусізацыі дало зусім ясныя і канкрэтныя ўстаноўкі ў гэтым абсягу. Праверыць, як выконваюцца гэтыя пастановы, бязьлітасна выкрываць канкрэтных носьбітаў супраціўленьня беларусізацыі, значна ўзмацніць барацьбу з тымі, хто зрывае беларусізацыю—вось задачы, якія стаяць перад партарганізацыямі. Трэба павесьці рашучае змаганьне з прымірэнцкімі адносінамі да тых, хто ня хоча на справе праводзіць пастаноў партыі аб беларусізацыі. Трэба зрабіць **рашучы карэнны пералом** у рабоце культурных установаў нашых прафсаюзаў (клюбаў, бібліятэк, гурткоў і г. д.) у справе ажыцьцяўленьня пастаноў партыі аб пераводзе нашай культурнай работы ў клюбах, бібліятэках і г. д. на беларускую мову.

У барацьбе за праверку пастаноў партыі аб беларусізацыі вялікую ролю павінен адыграць партыйны друк, які, гэта трэба адкрыта прызнаць, не аддае патрэбнай увагі гэтым пытаньням.

Трэба мабілізаваць шырокую грамадзкую думку пралетарскіх мас вакол строгай праверкі ва ўсіх савецкіх, прафэсыянальных, культурных і каапэрацыйных арганізацыях як імі **на справе** праводзяцца пастановы партыі аб беларусізацыі.

Цьвёрда праводзячы ў жыцьцё пастановы ЦК КП(б)Б аб беларусізацыі, няўхільна ажыцьцяўляючы ленінскую нацыянальную палітыку мы і надалей будзем пасьпяхова будаваць беларускую пралетарскую культуру, мы забясьпечым пасьпяховае разьвіцьцё нацыянальна-культурнага будаўніцтва нацменшасьцяй, мы будзем крок за крокам будаваць і ўзмацняць сацыялістычную Савецкую Беларусь.

За бальшавіцкія тэмпы беларусізацыі!

У ДЗЕНЬ ПЕРШАГА ЖНІЎНЯ

ПА ЎСІМ СЬВЕЦЕ МАРШАВАЛІ ПРАЛЕТАРСКІЯ КАЛЁНЫ ЗА СУСЬВЕТНУЮ РЭВАЛЮЦЫЮ, У АБАРОНУ СССР

Хваля пралетарскіх выступленьняў прарвала паліцэйскія кардоны

АДНА З САМЫХ МАГУТНЫХ ДЭМАНСТРАЦЫЙ РЭВАЛЮЦЫЙНАГА БЭРЛІНУ

БЭРЛІН, 1. Першажнівеньская дэманстрацыя бэрлінскага пралетарыяту, бязумоўна, была АДНЭЙ З САМЫХ МАГУТНЫХ, ЗГУРТАВАНЫХ І ВЯЛІКІХ ДЭМАНСТРАЦЫЙ РЭВАЛЮЦЫЙНАГА БЭРЛІНУ. Буржуазія і ўлады, не чакаўшыя такой магутнай дэманстрацыі, былі ЛІТАРАЛЬНА ЎСХВАЛЯВАНЫ. З 7-мі раёнаў маршавалі дзесяткі тысяч дэманстрантаў. Наперадзе калён дэманстрантаў ехалі атрады матацыклістых з чырвонымі сьцягамі. За імі ішлі калёны камуністых, камсамольцаў, групы рэвалюцыйнай прафпазыцыі, атрады рабочай самаабароны, рэвалюцыйныя фізкультурнікі, МОПР, міжрабпом, грузавікі з піянэрамі і інвалідамі. Ня толькі брук, але і тратуары былі запоўнены рабочымі, якія віталі воклічамі захапленьня калёны дэманстрантаў. Лёзунгі: «Толькі дыктатура пралетарыяту вызваліць нас ад капіталізму», «абернем імпэрыялістычную вайну ў грамадзянскую», «гора таму, хто нападзе на Савецкі Саюз», «далоў дыктатуру голаду», «далоў сацыял-фашыстых, прыслужнікаў дыктатуры Брунінга і Гінденбурга», «галасуйце 14 верасьня за кампартыю». Сяды і тады дэманстрантаў. На розных канцох пляцу з прамовамі выступілі т. т. Рэммеле, Нэйман, прадстаўнікі бастуючых тэкстыльшчыкаў Англіі, тав. Дорыё і г. д. Прамоўцаў сустракалі бурнымі апладысмэнтамі, якія часта пераходзілі ў авацыю. Паліцэйскія на раз няўдала прабавалі накіраваць калёны дэманстрантаў, ішоўшых на пляц, на больш глухія вуліцы.

АРГАНІЗАВАНАЯ САЦЫЯЛ-ДЭМАКРАТАМІ, У ПРОЦІВАГУ КАМУНІСТЫЧНАЙ ДЭМАНСТРАЦЫІ, ДЭМАНСТРАЦЫЯ Ў ЛЮСТГАРТЭНЕ МЕЛА НАДЗВЫЧАЙ СУМНЫ ВЫГЛЯД. Дэманстранты, пераважна прадстаўнікі рабочай арыстакратыі, літаральна замяшаліся на вялізарным пляцы. Прамоўцы выступілі са звычайнымі пацыфісцкімі заявамі аб «міры народаў», неабходнасьці перамогі сацыял-дэмакратаў на выбарах і з антысавецкім цкаваньнем.

ПАЛІТЗЬНЯВОЛЕНЫЯ ПРАЦЯГВАЮЦЬ ДЭМАНСТРАЦЫЮ ПРАТЭСТУ

ПАРЫЖ, 1. Барацьба за вызваленьне палітзьняволеных зьдулецца адным з лёзунгаў кампаніі 1 жніўня ў Францыі. «Юманітэ» канстатуе, што **палітзьняволеныя ў турме, на чале з тав. Андрэ Марці, а таксама палітзьняволеныя ў турме Пансі, пазбаўленыя рэжыму, які ўжываецца звычайна ў палітычных, працягваюць свае дэманстрацыі пратэсту.**

Новыя масавыя арышты ў Вільні

ВІЛЬНЯ, 2. НА ПРАЦЯГУ АПОШНІХ ДЗЁН ВІЛЕНСКАЯ ПАЛІЦЫЯ І ДЭФЭНЗЫВА ПРАВЯЛА ШМАТЛІКІЯ АРЫШТЫ Ў ВІЛЬНІ І ВАКОЛІЦАХ. АРЫШТАВАНА ШМАТ ДЗЯЧОЎ І ЧЛЕНАЎ ППС-ЛЯВІЦЫ.

У ЛІКУ АРЫШТАВАНЫХ ЗНАХОДЗІЦЦА САКРАТАР ВІЛЕНСКАГА АДДЗЯЛЕНЬНЯ ППС-ЛЯВІЦЫ КАЗІМІР РАДЗЭВІЧ.

АПРАЧА РАБОЧЫХ АРЫШТАВАНА ТАКСАМА ШМАТ СТУДЭНТАЎ ВІЛЕНСКАГА УНІВЭРСЫТЭТУ І ВІЛЕНСКАЙ БЕЛАРУСКАЙ ГІМНАЗІІ.

УСЯ ПАЛІЦЫЯ БЫЛА НА НАГАХ

ВАРШАВА, 1. Сёньня ў чаканьні першажнівеньскіх рабочых дэманстрацый УСЯ ВАРШАЎСКАЯ ПАЛІЦЫЯ НА НАГАХ, УЗБРОЕНАЯ БОЛЬШ ЗВЫЧАЙНАГА СНАРАЖЭНЬНЯ ГАЗАВЫМІ БОМБАМІ. З правінцыі паведамляюць АБ МАСАВЫХ АРЫШТАХ У СУВЯЗІ З ДНЁМ 1-ГА ЖНІЎНЯ. У афіцыяльным паведамленьні аб арыштах гаворыцца, што паліцыі ўдалося ў Сасноўцах захапіць акруговы камітэт польскай кампартыі. Арышты адбываюцца ў Львове і іншых гарадох.

ШМАТТЫСЯЧНЫЯ ДЭМАНСТРАЦЫІ

ПРАГА, 2. Паводле папярэдніх вестак, у Празе на цэлым радзе заводаў адбыліся мітынгі, на якіх выступалі камуністычныя прамоўцы. Прыняты рэзалюцыі, у якіх рабочыя **заяўляюць аб сваёй гатоўнасьці змагацца супроць падрыхтоўкі імпэрыялістычнай вайны, у абарону СССР.** На ўсіх дарогах, якія вядуць да ваколіц Прагі, цыркулявалі жандарскія патрулі. Аднак, ня гледзячы на ўсе паліцэйскія меры, адбыўся рад дэманстрацый. У адным з кварталаў паміж дэманстрантамі, якія прабавалі прарвацца праз паліцэйскі кардон, і паліцыяй адбылася сутычка. Увечары шматлікая конная і пешая паліцыя разганяла групы рабочых, якія зьбіраліся ў цэнтры гораду. Арыштавана некалькі дзесяткаў чалавек, у тым ліку два рэдактары камуністычнай «Рудэ Права». У Пільзэне ў мітынгу прымала ўдзел 3.000 рабочых ваенных заводаў Шкода. З прамовамі выступалі камдэпутаты. У Младой Болеславе, дзе знаходзіцца аўтамабільныя заводы Шкода больш 5.000 рабочых рушыліся да гораду, але жандарскі кардон стаў ім на дарозе. **Значная частка дэманстрантаў, аднак, прарвалася праз гэты кардон і нападзіла ў горадзе на пляцы-мітынг.** Арыштавана больш 20 рабочых.

Аднадзённая галадоўка пратэсту

ПРАГА, 1. Палітзьняволеныя ў Прагскай турме «Панкрац» праводзяць **аднадзённую галадоўку ў знак пратэсту супроць падрыхтоўкі да нападзеньня на СССР.**

НА МІТЫНГУ БЕСПРАЦОЎНЫХ

ПРАГА, 1. У Празе на мітынгу беспрацоўных з прамовамі аб кампаніі 1-га жніўня выступілі камуністычны сэнатар тав. Нядзьведзь і камуністычная дэпутатка тав. Чыжынская. Паліцыя груба накінулася на беспрацоўных. Тав. Чыжынская пры арышце была зьбіта паліцыяй.

ТОЛЬКІ ЎСТУПІЎШЫ НА ШЛЯХ РЭВАЛЮЦЫІ...

ЛЁНДАН, 1. Галоўная дэманстрацыя Лёнданскіх рабочых у дзень 1-га жніўня адбылася ў Тоўэрхэмлце. З прамовамі выступілі прадстаўнікі кампартыі т. т. Мерці і Леккі. Апошні ў сваёй прамове падкрэсьліў, што **«галоўны ўдар будучых войн будзе ў першую чаргу накіраваны супроць СССР** ня толькі таму, што палітычная сыстэма СССР прадстаўляе сабой небясьпеку для капіталістычнага сьвету, але і таму, што СССР прадстаўляе сабой найбагацейшую крыніцу сырцавых матар'ялаў і рынак для гатовых тавараў. **Толькі ўступіўшы на шлях рэвалюцыйнай барацьбы супроць брытанскага імпэрыялізму могуць ангельскія рабочыя забясьпечыць яго мір і абараніць Савецкі Саюз».**

Увечары адбыліся ва ўсіх раёнах Лёндану дэманстрацыі.

ПАД ЗНАКАМ РОСТУ ЎПЛЫВУ КАМПАРТЫІ

СТАКГОЛЬМ, 2. Першажнівеньскія дэманстрацыі сьведчаць аб **рашучым росьце ўплыву кампартыі.** Удзел рабочых у арганізаваных кампартыйнай дэманстрацыях быў нават **больш значным чым 1 мая.** Між тым, **дэманстрацыі, арганізаваныя рэнегатамі, ва многіх выпадках зусім праваліліся.** У Гецеборгу ў дэманстрацыях і трох галоўных мітынгах кампартыі, прымала ўдзел 8.000 рабочых. У дэманстрацыі, наладжанай рэнегатамі, прымала ўдзел усяго 30 чалавек. У Стакгольме кампартыя наладзіла дэманстрацыю, у якой удзельнічала больш 6.000 чалавек. Фашыстыя ня раз прабавалі справакаваць сутычку. У Гудзікевальле дэманстрацыя

Замежныя рабочыя дэлегацыі ў СССР

СТАКГОЛЬМ, 22. Як падаюць з Капэнгагена, гэтымі днямі ў СССР выяжджае **дэлегацыя дацкіх рабочых.** Дэлегаты выбраны на агульных сходах рабочых на заводах Капэнгагэна і правінцыі.

***

ПРАГА, 18. Па заводах і фабрыках **Чэха-Славакіі** праводзіцца збор сродкаў для жаночай дэлегацыі, якая пасылаецца ў канцы ліпеня ў СССР.

Ангельскія каапэратары ў дарозе

ЛЁНДАН, 21. Выехала ў СССР на параходзе «Ян Рудэутак» **дэлегацыя 24 ангельскіх каапэратараў.** Дэлегацыя мяркуе наведаць некалькі буйных цэнтраў у СССР і пазнаёміцца з савецкімі каапэрацыйнымі арганізацыямі.

(ТАСС).

***

БЭРЛІН, 23. Пад кіраўніцтвам «Саюзу прыяцеляў СССР» у Нямеччыне праведзена кампанія выбараў рабочых дэлегатаў для паездкі ў СССР. Усяго **выбрана 45 дэлегатаў, якія выяжджаюць 3 жніўня ў СССР.** Сродкі на праезд за граніцу ў СССР і назад як і на аказаньне матар'яльнай дапамогі сем'ям дэлегатаў, былі сабраны на заводах.

Другі міжнародны кангрэс глебаведаў

ЛЕНІНГРАД. У вялікай канфэрэнц-залі Акадэміі Навук 20 ліпеня адчыніўся **другі міжнародны кангрэс глебаведаў,** які сабраў з усіх канцоў зямной кулі шматлікія групы вучоных-глебаведаў. На адкрыцьці прысутнічалі: старшыня аблвыканкому **т. Кадацкі, нямецкі, італьянскі і фінляндзкі консулы,** акадэмікі і прафэсары. У прэзыдыуме—віцэ-прэзыдэнт міжнароднага кангрэсу глебаведаў д-р **Хісінк** (Галяндыя), **Лемэрман** (Нямеччына). **Вігнэр** (Швэйцарыя), **Дюмолон** (Францыя), **Джон Русэль** (Англія), **Нарбут** (ПАЗШ), **Мікпаэўскі** (Польшча), прафэсар **Ярылаў** і акадэмік **Самойловіч.**

Удзельнікі міжнароднага кангрэсу

ЛЕНІНГРАД, 23. У работах міжнароднага кангрэсу глебаведаў прымаюць удзел прадстаўнікі большасьці краёў сьвету. Інфармбюро сабраны даныя аб нацыянальным складзе ўдзельнікаў кангрэсу. Найбольш шырока прадстаўлена **амэрыканская дэлегацыя,** якая складаецца з 42 чал. Вельмі шырока прадстаўлена **нямецкая дэлегацыя —32 чал. Японія** прыслала 7 прадстаўнікоў, **Галяндыя і Англія** таксама па 7 чал., **Польшча—4, Швэйцарыя —5, Чэха-Славакія —3, Францыя 6.** Ёсьць таксама прадстаўнікі **Данцыгу, Румыніі, Швэйцарыі, Судана, Гішпаніі, Канады, Малайскіх выспаў і інш.**

У той жа час у краіне пераможнага сацыялізму

У чырвонай сталіцы

Па ўсіх раёнах Масквы адбыліся мітынгі, прысьвечаныя міжнароднаму чырвонаму дню. У парку культуры і адпачынку і яго філіялах, па раёнах былі праведзены нарады атрадаў Асавіяхіму. З вялікім дакладам аб значэньні дня 1-га жніўня, выступіў у Сокальніцкім філіяле парку культуры і адпачынку т. Яраслаўскі.

«Сёньнішні дзень, дзень агляду баявых сіл пралетарыяту. Мы не павінны забываць, што заграніцай ідзе новая падрыхтоўка вайны супроць першай у сьвеце пралетарскай дзяржавы. Буржуазія затрачвае вялізарныя сродкі на ўзбраеньне і вышкаленьне. Усё што было затрачана ў імпэрыялістычнай вайне — 1914-18 году, нішто на параўнаньні з тым, што яны рыхтуюць для будучай вайны. Вялізная машына капіталу з турмамі, судамі заўтра-ж гатова на нас абрушыцца. Было-б маладушным і ганьбай для нас, бальшавікоў, калі-б мы схіліліся свае сьцягі перад гэтай варожай сілай. Наша задача — аб'яднаць рабочую клясу вакол Камінтэрну, выхаваць яе, вырваць з-пад уплыву буржуазных партый і мабілізаваць для будучых баёў за дыктатуру пралетарыяту. Мы павінны давесьці кожнаму работніку, работніцы, што пароза міру існуе, не ня будзе тады, калі буржуазія будзе скінута. Адзінай бацькаўшчына пралетарыяту — СССР. Гэта бацькаўшчына адабыта крывёю цэлага пакаленьня рабочае клясы, яе трэба ня толькі адстойваць, але і ўмацоўваць. Кожная тона жалеза, кожны трактар, калгас, атрад камсамолу — гэта ўсё ўмацоўвае магутнасьць СССР».

На ўсіх мітынгах выступалі прадстаўнікі кампартыі, Чырвонай арміі і іншыя.

У ГОРАДЗЕ ЛЕНІНА

ЛЕНІНГРАД, 1. Сьвяткаваньне міжнароднага чырвонага дня ў Ленінградзе прайшло з вялікім уздымам. У лягерах, куды выяжджалі рабочыя шэфы, адбыліся лятучыя мітынгі і гутаркі. Паміж многімі заводамі і падшэфнікамі заключаны дагаворы аб спаборніцтве. У часьцях і на караблёх Балтфлёту адбыліся мітынгі і гутаркі, на якіх выступілі палітэмігранты.

ІДЗЕ НОВЫ ХЛЕБ

Мазыршчына і Брагіншчына не падрыхтаваліся да яго прыёмкі

Паралізаваць манэўры кулацкай агентуры ў загатоўчым апараце

Разгарнуць кампанію за сушку збожжа

Пры правядзеньні хлебазагатовак гэтага году мы стаім перад небясьпекай, што збожжа можа быць вялікай вільготнасьці, бо ўборка праходзіць пры вельмі дажджлівым надвор'і.

Купані менш за ўсё зацікаўлены ў здачы дзяржаве добраякаснага сухога збожжа і, зразумела, будуць імкнуцца ўсялякімі мерамі прасунуць вільготнае збожжа. Супроць гэтага трэба правесьці рашучую барацьбу і ўжыць меры для падсушкі збожжа.

На сёньнішні дзень прыёмныя пункты Саюзхлебу маюць усяго 5 збожжасушылак. Тэмпіна патрабаваны яшчэ 10 збожжасушылак. Усё-ж адкімі збожжасушылкамі Саюзхлеба нельга будзе прасушыць усё збожжа, калі яно паступіць у вільготным выглядзе.

Неабходна зараз-жа разгарнуць шырокую кампанію на вёсцы за тое, каб хлеб здаваўся дзяржаве сухім, за авіяную сушку хлеба калектыўнымі і індывідуальнымі гаспадаркамі.

Сушка хлеба павінна праводзіцца адначасова з уборкай з тым, каб не замаруджваць тэмпу хлебазагатовак. Шляхам разгортваньня растлумачальнай работы неабходна даць зразумець селяніну, што ад прасушкі збожжа ён нічога ня траціць. Селянін павінен ведаць, што сёлета збожжа будзе аплачвацца ў залежнасьці ад яго якасьці. Чым больш сухое збожжа здасьць селянін, тым больш высокую цану ён атрымае за яго.

Белкалгасцэнтр павінен зараз-жа паслаць на месцы распараджэньне аб тым, каб калгасы ў першую чаргу павялі шырокую кампанію за сушку збожжа. Не павінна быць ні адкаго калгасу, які-бы здаў хаця-б кілёграм вільготнага збожжа.

Да справы прасушкі збожжа трэба прыцягнуць усю вясковую грамадзкасьць.

Правядзеньне шырокай агітацыйна-растлумачальнай работы мы павінны дабіцца, каб на склады Саюзхлебу і інш. прыёмачных пунктаў не паступіла вільготнае збожжа, якое можа сапсаваць нашы запасы.

Чырвоны абоз з 500 пуд. збожжа

ЖЛОБІН. (НАШ КАР.). 1-ГА ЖНІЎНЯ Ў ГОРАД ПРЫБЫЎ ПЕРШЫ ЧЫРВОНЫ АБОЗ З НОВЫМ ХЛЕБАМ КАЛГАСУ «РАСЬСЬВЕТ-ПЕРАМОЖЦА. ЧЫРВОНЫ АБОЗ СУСТРЭЛІ ПРАДСТАЎНІКІ ПАРТЫЙНЫХ, РАБОЧЫХ І САВЕЦКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ. АБОЗ ПРЫВЁЗ 500 ПУД. ХЛЕБА.

ПА ЎСІМ РАЁНЕ З ПОСЬПЕХАМ ПРАХОДЗІЦЬ ЎБОРКА ЎРАДЖАЮ.

У ПАЛОНЕ ЛІКВІДАЦЫЙНЫХ НАСТРОЯЎ

МАЗЫР. (Наш кар.). Мазырскае аддзяленьне Белкаапсаюзу вельмі мала ўвагі аддае збожжазагатоўкам—важнейшай палітычнай кампаніі дня.

Працаўнікі аддзяленьня дэмабілізацыйна настроены ў сувязі з ліквідацыяй акругі і зусім забылі, якая адказнасьць на іх ускладаецца. Між тым спажывецкая каапэрацыя зьяўляецца аспэўным загатоўцам збожжа ў акрузе.

Паводле дырэктыў Белкаапсаюзу, мазырскае аддзяленьне павінна было мабілізаваць увесь акруговы і нізавы каапэрацыйны актыў, праверыць падрыхтаванасьць складской гаспадаркі, падрыхтаваць прыёмшчыкаў збожжа. На справе мы маем зусім іншае. Збожжазагатоўкамі займаецца адзін толькі кансультант па загатоўках усіх відаў сырцу, які за ўвесь час абмежаваўся тым, што паслаў раёнам разнарадку.

Загадчык аддзяленьня т. **Ткач** заявіў таго, каб прыняць рашучыя меры па мабілізацыі ўсіх прапаўнікоў на збожжазагатоўкі, чакае пакуль... Белкаапсаюз выпле сваіх інструктароў па раёны.

Зусім ня зьвернута ўвага на склады. Аддзяленьне абмежавалася толькі запатрабаваньнем для Белкаапсаюзу вестак аб паяўнасьці складской гаспадаркі. У выніку такіх агідных тэмпаў работы, большасьць складаў не ахлабанена пад збожжа, а загружана сольлю і іншымі таварамі.

Калі ахлабаніць усе склады, дык яны могуць змясьціць каля 3.700 тон, у той час, як заданьне па акрузе дасягае 4.500 тон. Такім чынам, пры самых спрыяючых умовах не хапае складаў на 900 тон хлеба, а загадчык аддзяленьня ўсе падзеі ўскладае на раёны, а само аддзяленьне рыхтуецца да... ліквідацыі і чысткі.

Паводле заданьня праўленьня Белкаапсаюзу, у Рэчыцы павінны быць арганізаваны 20-дзённыя курсы для падрыхтоўкі прыёмшчыкаў збожжа. Ад Мазырскай акругі трэба было паслаць 30 прыёмшчыкаў, зьявілася 7. У выніку — курсы сарваліся, і акруга засталася без кваліфікаваных прыёмшчыкаў збожжа.

Для рабочага забясьпячэньня мазырскае аддзяленьне павінна было ў ліпені загатовіць 60 тон скарасьпелай бульбы. Загатоўлена толькі 4 цэнтн.

Вось факты, якія кажуць аб тым, што патрэбны тэрміновыя меры, каб ліквідаваць дэмабілізацыйныя настроі каапэрацыйных прапаўнікоў, каб прымусіць іх на-баявому ўзяцца за работу.

Н. Г.

Дрэнна з кадрамі і складамі

БРАГІН, (Гомельшчына). На Брагінскім раёне пачаліся збожжазагатоўкі. Першымі пачалі здаваць хлебныя ліпікі калгасы. Калгасы «Чырвоная Зара», «Добраахвотнік» даставілі збожжа чырвоным абозамі на ссыпныя пункты.

Трэба адначасьна, што раён яшчэ не падрыхтаваны да прыёму хлеба. Загатуль на месцах не праведзена належнай растлумачальнай работы вакол загатовак, ня гледзячы на тое, што ў мінулым годзе было дапушчана шмат памылак і што плян загатовак большы, чым мінулы.

Брагінскі раён адзін з найбольш ураджайных раёнаў Беларусі. Трэба дабіцца, каб увесь таварны хлеб панаў у каапэрацыйныя і дзяржаўныя арганізацыі, а ня ў рукі прыватніку. Трэба падрыхтаваць кадры, якія заняліся-б збожжазагатоўкамі. Загатуль падрыхтавана толькі 5 чалавек. Трэба мабілізаваць новых работнікаў, але пакуль для гэтага нічога ня робіцца.

Вельмі дрэнна з памяшканьнямі пад збожжа. Яшчэ ня скончаны рамонт існуючых складаў, толькі распачалася пабудова новага складу. Марудна ідзе ў пабудове тлумачыцца бяздушнымі, бюракратычнымі адносінамі мясцовых арганізацый. Паміж спажывецкай каапэрацыяй і райкалгасаюзам няма даговранасьці ў разьмеркаваньні функцый у справе хлебазагатовак.

Трэба нагнаць упушчанае, каб адпаведным чынам сустрэць новае збожжа.

Брыгадзір «Зьвязды»
КЛІМАЎ

АД РЭДАКЦЫІ:

У [illegible] з тым, што на верасьнёўскім пленуме ЦК КП(б) [illegible] стаіць пытаньне аб бліжэйшых задачах КП(б)Б у галіне нацпалітыкі, рэдакцыя зварачаецца да т. т. з просьбай выступіць на старонках „Зьвязды" з артыкуламі, прапановамі па пытаньнях далейшага ажыцьцяўленьня нацпалітыкі партыі.

Пытаньні беларусізацыі, барацьбы з шавінізмамі, тэарытычная распрацоўка пэўных пытаньняў і г. д.—усё гэта павінна знайсьці адбітак на старонках „Зьвязды"

Адозва ўраду Нямеччыны

БЭРЛІН, 18. Агенцтва Вольфа паведамляе, што ў сувязі з роспускам рэйхстагу ўрад апублікаваў адозву да «нямецкага народу», у якой абвяшчаецца, што назначная парляманцкая большасьць, пазбаўленая ўнутралога адзінства і няздольная да прыняцьця на сябе адказнасьці, адхіліла выданьня прэзыдэнтам рэспублікі дэкрэты на падставе 48 параграфу.

«Нямецкі народ, — гаворыцца далей у адозве, — 14 верасьня ў дзень новых выбараў павінен будзе вырашыць, ці адкажоць ён ураду ў правядзеньні мераправемстваў, неабходных для ўпарадкаваньня фінансаў, для ўзмацненьня нямецкае гаспадаркі і для выкананьня сацыяльных абавязацельстваў».

Тыраж

Па-бальшавіцку праводзіць беларусізацыю

Руйнуючы ўдар па тых, хто зрывае нацыянальную палітыку партыі і гэтым самым дапамагае клясаваму ворагу

„Сутнасьць ухілу да вялікадзяржаўнага шавінізму заключаецца ў імкненьні абыйсьці нацыянальныя адрозьненьні мовы, культуры, быту; у імкненьні падрыхтаваць ліквідацыю нацыянальных рэспублік і абласьцей; у імкненьні падарваць прынцып нацыянальнага раўнапраўя і разьвянчаць палітыку партыі па нацыяналізацыі апарату, нацыяналізацыі прэсы, школы і іншых дзяржаўных і грамадзкіх арганізацый.

(СТАЛІН—з дакладу на XVI партзьезьдзе)

Да адказнасьці тых, хто зрывае беларусізацыю

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі дасягнуты вялікія посьпехі ў справе беларусізацыі, у справе стварэньня культуры нацыянальнай па форме і пралетарскай па зьместу.

Стварэньне Акадэміі Навук, Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту і раду вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, тэатраў, разьвіцьцё пралетарскай беларускай літаратуры, друку увядзеньне ўсеагульнага абавязковага навучаньня, нарэнізацыя апарату, рост і пашырэньне культуры працоўных нацменшасьцяй, — вось яскравыя паказальнікі росту нашай культуры.

Усе гэтыя посьпехі дасягнуты ў выніку правільнага правядзеньня нацыянальнай ленінскай палітыкі партыі, якая згуртавала ў адну сям'ю працоўных усіх нацыянальнасьцяй Савецкай Беларусі і Савецкага Саюзу. Гэтыя посьпехі дасягнуты ў бязьлітасным змаганьні з вялікадзяржаўным шавінізмам, з беларускім нацыянал-дэмакратызмам і іншымі шавінізмамі.

XVI зьезд УсеКП(б) з асаблівай сілай падкрэсьліў неабходнасьць далейшага імкнага рашучага і бязьлітаснага змаганьня з вялікадзяржаўным шавінізмам, як галоўнай небясьпекай, у правядзеньні нацыянальнай палітыкі партыі, і таксама з мясцовымі шавінізмамі — беларускім, польскім, яўрэйскім і інш. XIII зьезд КП(б)Б паставіў перад партыйнымі арганізацыямі пытаньне аб неабходнасьці яшчэ больш рашучага ўзмацненьня тэмпаў беларусізацыі. XIII зьезд КП(б)Б даў дырэктыву партыйным арганізацыям, працягваючы пасьлядоўнае рашучае змаганьне з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, мабілізаваць партыйныя масы на рашучы адпор узрастаючай небясьпецы вялікадзяржаўнага шавінізму і шавінізмаў усіх нацыянальнасьцяй.

Аб тым, што вялікадзяржаўны шавінізм за апошні час значна ўзрос, узмацніўся, актывізаваўся, перш за ўсё, гаворыць тыя прабелы ў некаторых мясцох, якія мы маем за апошні час у справе правядзеньня беларусізацыі. Аб гэтым сьведчаць і тыя матар'ялы, якія нам даў налёт рабочых брыгад па праверцы стану беларусізацыі ў некаторых установах і прадпрыемствах Менску.

Што выявіў налёт? Дырэктывы партыі і ўраду аб узмацненьні тэмпаў беларусізацыі ў некаторых мясцох ня выконваюцца, у лепшым выпадку выконваюцца фармальна. Такая ўстанова, як ВСНГ, якая пастановай ЦК КП(б)Б ад 10 лістапада 1929 г. занесена ў лік тых, якія фармальна адносяцца да беларусізацыі — і дагэтуль не зрабіла перапому ў справе беларусізацыі. Адказныя работнікі апарату ВСНГ дагэтуль гаворыць выключна на расійскай мове. Тамжа мае месца яўнае супраціўленьне беларусізацыі з боку некаторых работнікаў. Але ні партячэйка, ні адміністрацыя не мабілізавалі думкі мас навакол гэтых канкрэтных праяў вялікадзяржаўнага шавінізму.

У Белдзяржгандлі, ня гледзячы на тое, што бюро партячэйкі атрымала вымову ад Фрунзаўскага РК КП(б)Б — мы маем паўтарэньне памылак. Так, супрацоўнік Белпайгандлю ПАДОКСІС прынцыпова ня хоча гаварыць на беларускай мове, але ніхто на гэтыя факты не рэагуе.

Мы маем падобнае становішча з беларусізацыяй у МЦРК і Менскім аддзяленьні Белкаапсаюзу. У Белкаапсаюзе не праведзена ў жыцьцё пастанова акруговай нацкамісіі аб спагнаньні загадчыку Менскім аддзяленьнем Белкаапсаюзу за ігнараваньне беларусізацыі.

На лепш справа ў такіх прафсаюзах, як саўгандальслужачых, нарсувязі. Там ЦП саюзаў нават ня ведаюць, як выконваюцца дырэктывы аб беларусізацыі на мясцох (саюз саўгандальслужачых), нават не займаюцца пытаньнем беларусізацыі (ЦП саюзу нарсувязі).

Брыгада, якая абсьледвала становішча беларусізацыі ў клюбах і клюбных бібліятэках выявіла поўную адсутнасьць правядзеньня масавай работы на беларускай мове. Ня гледзячы на тое, што беларуская пралетарская кніжка мае вялікі попыт сярод рабочых («Камунар», «Энэргія»)—у нашых бібліятэках няма патрэбнай колькасьці гэтых кніжак. Больш таго, мы маем агіднейшыя нядбайныя адносіны з боку саміх бібліятэкараў да справы прасоўваньня беларускай пралетарскай кніжкі ў масы рабочых.

Так, У КЛЮБЕ МЭТАЛІСТЫХ З 10.000 КНІЖАК БІБЛІЯТЭЧНАГА ФОНДУ ЁСЬЦЬ УСЯГО 150 БЕЛАРУСКІХ. Загадчык бібліятэкай сам не разьбіраецца ў беларускай літаратуры, а таму ня мае ніякага заданьня арганізаваць там гурток па вывучэньні беларускай пралетарскай літаратуры.

Бібліятэка клюбу будаўнікоў пічыць асабліва няпрыемным прапанаваць чытачу беларускую кніжку. У Белжылсаюз, дзе працуе 1.500 рабочых была накіравана кніжная перасоўка з 300 кніг, сярод якіх усяго 26 беларускіх.

На такіх прадпрыемствах, як завод «Камунар», друкарня імя Сталіна, шпалерная фабрыка—беларусізацыя праводзіцца фармальна. Партячэйкі і ФЗК амаль ніякай работы не праводзяць па ўзмацненьні тэмпаў беларусізацыі. А на пабудове Дому Ўраду партыйная і камсамольская ячэйкі нават не рэагавалі на тыя праявы вялікадзяржаўнага шавінізму, якія мелі месца ў апошнія дні.

Факты выяўленыя брыгадамі ў радзе ўстаноў і прадпрыемстваў павінны прыцягнуць увагу ўсіх партыйных, камсамольскіх, прафсаюзных, савецкіх арганізацый.

Ні на хвіліну не паслабляючы барацьбы з беларускім нацыянал-дэмакратызмам, іншымі шавінізмамі, мы павінны накіраваць руйнуючы агонь па праявах вялікадзяржаўнага шавінізму,— які ва ўмовах Беларусі часьцей за ўсё праяўляецца ў супраціўленьні беларусізацыі.

Трэба прыцягваць да адказнасьці, зьнімаць з работы тых, хто супраціўляецца беларусізацыі, хто зрывае правядзеньне ленінскай нацыянальнай палітыкі партыі.

За неадкладнае выкананьне дырэктыў 16-га зьезду УсеКП(б) і 13-га зьезду КП(б)Б! За ўдарныя, баявыя тэмпы беларусізацыі.

А. С.

З сёнешнім нумарам газэты „Зьвязда" падпісчыкам рассылаецца дармовы дадатак—газэта

„ПРАФРУХ" № 21

Што выявіў налёт рабочых брыгад

28-29 ліпеня рэдакцыя „Зьвязды" разам з Фрунзаўскім райкомам КП(б)Б, арганізавала налёт на некаторыя ўстановы і прадпрыемствы г. Менску з мэтай выяўленьня становішча беларусізацыі ў іх.

Аб'ектамі былі: ВСНГБ, ПОШТА і ТЭЛЕГРАФ, БЕЛПАЙГАНДАЛЬ, ЗАВОД „КАМУНАР", ЦСПСБ, ЦП ПААСОБНЫХ САЮЗАЎ.

Агляд-абсьледваньне праводзілі рабочыя брыгады ў складзе 3-4 чалавек.

30 ліпеня ў Фрунзаўскім райкоме на нарадзе брыгадзіраў разам з прадстаўнікамі рэдакцыі былі заслуханы справаздачы 8 брыгад.

Ніжэй мы зьмяшчаем матар'ялы, атрыманыя ў выніку налёту.

Фармальныя адносіны

У галіне беларусізацыі прадпрыемстваў мы маем значныя дасягненьні. Палепшылася становішча беларусізацыі ў масавай рабоце, павялічыўся пераход работы ФЗК і грамадзкіх арганізацый фабрык і заводаў на беларускую мову, узрасла зацікаўленасьць беларускай літаратурай, — вось паказальнікі, якіх мы дабіліся, дзякуючы правільнай нацыянальнай палітыцы КП(б)Б і яе ЦК.

У той-жа час мы маем на асобных прадпрыемствах нераазуменьне значэньня беларусізацыі і адставаньне ў правядзеньні апошняй. На самых адсталых прадпрыемствах у гэтай галіне мы і спынімся.

БЕЛАРУСІЗАЦЫЯ Ў АДПАЧЫНКУ

Брыгадзіры «Зьвязды» і Фрунзаўскага РК КП(б)Б т. т. Грыб і Ляўковіч пры абсьледваньні становішча беларусізацыі на заводзе «Камунар» выявілі шмат недарэчнасьцяй. Тэхнічны, кіруючы пэрсанал у большасьці працуюць на расійскай мове. Беларусізацыя заключаецца толькі ў тым, што машыністка робіць дакладныя пераклады пратаколаў і адносін з расійскай мовы на беларускую.

Беларуская мова ў гурткоўых заняткох і ў масавай рабоце зусім ня ўжываецца. Нават лёзунгі, якія характарызуюць дзейнасьць БССР, таксама ў большасьці напісаны на расійскай мове.

Парткалектыў і ФЗК ня прымаў ніякіх захадаў да паляпшэньня становішча беларусізацыі. Нават ня створаны гурткі па вывучэньні беларускай мовы. Той факт, што на 950 рабочых, сярод якіх многа камуністых, выпісваюць толькі 100 экзэмпляраў беларускіх газэт, яшчэ раз пацьвярджае **недапушчальныя адносіны парткалектыву і ФЗК да гэтага пытаньня.**

«ПАЧЫНАЕМ НА БЕЛАРУСКАЙ МОВЕ, А КАНЧАЕМ НА РАСІЙСКАЙ»

Здавалася, што ў друкарні імя Сталіна БДВ справа з беларусізацыяй павінна была-б знаходзіцца ў іншым становішчы. Праўда, дасягненьні друкарні заключаюцца ў тым, што тэхнічная работа пераведзена выключна на беларускую мову. Але гэта нас ня можа задаволіць. **Нам патрэбна не фармальная беларусізацыя.**

Сам сакратар парткалектыву друкарні з усёй шчырасьцю прызнаўся, што **«сходы пачынаем на беларускай мове, а канчаем парасійску».** Сыстэматычнай работы ў справе беларусізацыі ў друкарні мы зусім не наглядаем.

Чырвонай істужкай праходзіць па ўсёй рабоце **стаўка на самаёк на «казённыя» адносіны.**

ФАРМАЛІЗМ, А НЯ ШТОДЗЕННАЯ РАБОТА

Брыгадзіры т. т. Клянтук і Галавач расказваюць аб становішчы беларусізацыі на шпалернай фабрыцы Беларуская мова ігнаруецца нават кіраўнікамі фабрыкі. Дырэктар фабрыкі, сакратар калектыву і старшыня ФЗМК ня ўжываюць беларускую мову ў гутарках. Нават, калі некаторыя рабочыя зварачаюцца да іх на беларускай мове, дык яны атрымліваюць адказ на расійскай мове. Усе абвесткі ФЗК і большасьць загадаў адміністрацыі выключна пішуцца на расійскай мове.

Беларускія газэты на шпалернай фабрыцы зусім ня выпісваюцца. У ФЗК свае «аб'ектыўныя прычыны» — ня было часу, усе ў водпуск пайшлі».

Цікава, што-ж адкажа ФЗК і парткалектыў на такое запытаньне, чаму яны не займаюцца пытаньнем паляпшэньня становішча беларусізацыі на фабрыцы? А гэта-ж факт. Ні аднаго гуртку аб вывучэньні беларускай мовы на сёнешні дзень няма, а масавая работа, якая паогул кульгае, і тая праводзіцца на расійскай мове.

На пабудове **Дому Ўраду** з беларусізацыяй яшчэ горш абстаіць справа. Партыйныя і камсамольскія ячэйкі пабудовы **Дому Ўраду** зусім не займаліся гэтай справай і нават не рэагавалі па розных выступленьні вялікадзяржаўных шавіністых, якія прабавалі высьмейваць беларускую мову Пытаньне аб іх нідзе ня ставілася і не абгаворвалася. У выніку — гэтыя вылазкі не атрымалі патрэбнага адпору з боку рабочых мас.

Такое становішча з беларусізацыяй тлумачыцца выключна тым, што адпаведныя арганізацыі гэтых прадпрыемстваў недаацанілі, а ў некаторых выпадках і не жадалі выконваць зусім выразныя дырэктывы партыі ў галіне нацпалітыкі.

Брыгадзіры

Прафсаюзы—за правядзеньне беларусізацыі!

Саюз саўгандальслужачых

Нам давялося абсьледваць цэнтральныя праўленьні саюзаў: **Саўгандальслужачых, Нарсувязі і ЦСПСБ.**

Па саюзе саўгандальслужачых тэхнічны апарат пераведзен цалкам на беларускую мову. На беларускай мове вядзецца ўся перапіска з пізавымі арганізацыямі відуца пратаколы, пасяджэньні прэзыдыуму. Але масавыя сходы, нарады актыву, праходзяць пераважна па расійскай мове. Працаўнікі ЦП як адказныя, так і тэхнічныя, моваю ўладаюць але ў быце, у гутарках яе ня ўжываюць.

Паводле заявы старшыні ЦП асабліва дрэнна стаіць справа з беларусізацыяй у **Віцебскай акрузе.** Наогул-жа дакладных матар'ялаў з месц аб выкананьні партыйных дырэктыў у галіне беларусізацыі па саюзе ЦП ня мае.

Былі выпадкі праяў вялікадзяржаўнага шавінізму антысэмітызму сярод работнікаў Дзяржстраху, на пабудове унівэрсытэцкага гарадка, у Бабруйску, Мазыры і Віцебску. Шырокае грамадзкае думкі навакол гэтых пасабных фактаў на мясцох не стваралася.

Прафарганізацыі ня сочаць за выкананьнем у вызначаны тэрмін пастаноў аб абавязковым вывучэньні беларускай мовы ўсімі работнікамі. Не вядзецца работа па змаганьні з ігнараваньнем беларускай мовы некаторымі работнікамі.

Саюз Нарсувязі

У ЦП саюзу нарсувязі тэхнічны пэрсанал уладае беларускаю моваю, і тэхнічная работа праўленьня поўнасьцю праводзіцца на беларускай мове. Але і зноў-жа ў гутарках з паведвальнікамі беларуская мова імі ня ўжываецца. **Беларускай мовай дагэтуль слаба ўладаюць адказныя работнікі.**

Пытаньнем беларусізацыі апарату на мясцох ЦП не займалася і ніякіх матар'ялаў наконт гэтага няма.

Змаганьне з праявамі антысэмітызму таксама вялося ня так, як трэба. Справа перадавалася ў суд, але добрай масавай, растлумачальнай работы наўкол гэтага пытаньня ня было.

У ЦСПСБ

У ЦСПСБ **ня ўвесь апарат добра ўладае беларускай моваю.**

Дырэктыва прэзыдыуму ЦСПСБ аб беларусізацыі прафапарату і вывучэньні беларускае мовы работнікамі ЦСПСБ у 6-цітыднёвы тэрмін ня выканана.

14 мая бягучага году, паводле прапановы пацкамісіі ЦВК, культэктарам ЦСПСБ распачата праверка становішча беларусізацыі прафапарату па мясцох, але дагэтуль справа ня скончана і аб яе ходзе няма ніякіх вестак.

Брыгада:
Шахлевіч, Сакалоўскі
Лазарэнкак і Малей.

Дырэктывы апынуліся ў сталох установы

Дырэктывы партыі аб рашучым, неадкладным правядзеньні беларусізацыі ў жыцьцё абавязвалі нашы ўстановы ня толькі забясьпечыць поўны пераход тэхнічнай работы на беларускую мову (так разумеюць некаторыя працаўнікі), але рашуча адмовіцца ад тых фармальных адносін і **адставаньня ў тэмпах беларусізацыі,** якія назіраліся ў **ЦСУ, ВСНГБ, Наркамгандлі, Наркамфіне** і г. д.

На справе-ж мы бачым, што гэтыя дырэктывы **ЦК КП(б)Б** у гэтай галіне ажыцьцяўляюцца надзвычайна марудна. Той самы **ВСНГБ,** які пастановай ЦК КП(б)Б ад 10-га лістапада 1929 году занесен у лік установаў, што фармальна адносяцца да справы беларусізацыі, яшчэ да гэтага дня не зрабіў пералому, якога патрэбна было чакаць у выніку пастановы **ЦК КП(б)Б.** Крыху фактаў:

І адказныя і неадказныя работнікі **ВСНГБ** усю работу праводзяць на расійскай мове, а як толькі даходзіць справа да пратаколаў, цыркуляраў, дырэктыў, дык машыннае бюро ўсё гэта перакладае. У гэтым ёсьць беларусізацыя **ВСНГ.**

Характэрна тое, што ўсе супрацоўнікі, добра ведаючы беларускую мову, ня ўжываюць яе ў асабістых гутарках і ў штодзённым жыцьці. Гэта нельга інакш расцэньваць, як яўнае супраціўленьне беларусізацыі.

Парт'ячэйка і мясцком пры **ВСНГБ** вакол гэтага не завастраюць увагі грамадзкасьці, не дамагаліся карэннага пералому такіх адносін. Ставячы гэта другараднай задачай, нават і адміністрацыя нічога не зрабіла ў мэтах паляпшэньня становішча з беларусізацыяй. Як вынік такіх адносін, мы маем пераважную большасьць выступленьняў на агульных сходах і пасяджэньнях на расійскай мове.

Белдзяржгандаль яшчэ дагэтуль пайшоў. Бюро партыйнай ячэйкі за дрэннае ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі ў галіне беларусізацыі ўжо атрымала ад **Фрунзаўскага РК КП(б)Б** вымову. Гэтыя ўрокі ня былі скарыстаны ў далейшай рабоце. **І замест выпраўленьня дапушчаных памылак мы маем паўтарэньне іх.**

Работа аддзелаў як **лесазагатоўчага, будаўнічага і ўтылізацыйнага і** інш. яшчэ да гэтага дня не пераведзена на беларускую мову. Ёсьць выпадкі адкрытых вылазак супроць беларусізацыі (Белпайгандаль). Супрацоўнік **Белпайгандлю Падоксін** прынцыпова ня хоча гаварыць з наведвальнікамі на беларускай мове. Партыйная ячэйка і адміністрацыя ня прыняла адпаведных мер у адносінах да такіх асоб, **якія сваімі дзеяньнямі парушаюць правільную нацыянальную палітыку КП(б)Б.**

«Партыйныя ячэйкі павінны ўзмацніць увагу да пытаньняў беларусізацыі, у мэтах хутчэйшага ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі аб беларусізацыі дзяржаўных і прафсаюзных і інш. устаноў, праводзячы сыстэматычную праверку выкананьня дырэктыў па беларусізацыі».

Трэба з усёй рашучасьцю ўзяцца за ажыцьцяўленьне гэтых важных дырэктыў партыі.

Брыгада «Зьвязды» і Фрунзаўскага РК КП(б)Б.

Беларуская пралетарская літаратура мае вялікі попыт у рабочых

Бібліятэчныя-ж работнікі ігнаруюць ее

Брыгада, што абсьледвала становішча беларусізацыі ў клюбах і клюбных бібліятэках, выявіла вялікі попыт на кніжкі беларускіх пралетарскіх пісьменьнікаў з боку рабочых.

Але справа прасоўваньня гэтай кніжкі ў масы рабочых часьцей за ўсё упіраецца ў нядбайныя адносіны да гэтай справы саміх бібліятэкараў і клюбных работнікаў.

Клюб мэталістых

У бібліятэцы клюбу мэталістых з **10.000 кніжок бібліятэчнага фонду толькі 150—беларускіх.** Загадчык бібліятэкі скардзіцца:

— Вельмі цяжка прыцягнуць да ўдзелу ў бібліятэчнай рабоце беларускіх пісьменьнікаў. **А самі мы ня зусім добра разьбіраемся ў беларускай літаратуры...**

Каталёгу кніг няма. А між тым, імепна бібліятэка клюбу мэталістых набывае кніжныя навіны самастойна, мінуючы калектар ЦСПСБ.

Бібліятэчныя кніганошы прасоўваюць на асобныя прадпрыемствы **10—12 процантаў** беларускіх пралетарскіх кніжок, і тыя-выданьні старых гадоў. У той-жа час **чытаньне беларускай літаратуры, напрыклад, на заводах «Камунар» і «Энэргія»—добрае.** Рабочыя цягнуцца да пралетарскае кнігі на беларускай мове, але гэтых кніжак у бібліятэках і клюбу не хапае.

Ніякіх гурткоў па вывучэньні беларускае літаратуры, беларускае мовы пры бібліятэцы няма.

Пры клюбе мэталістых наогул няма шырокай масавай работы. Пастаноўкі, вечары і інш. большай часткай праводзяцца на расійскай мове. У галіне ўкараненьня беларусізацыі ў рабочыя масы нічога ня робіцца. Адміністрацыя толькі **думае,** паводле сацыялістычнага даганору, перавесьці на беларускую мову клюбную работу.

Клюб будаўнікоў

Уся тэхнічная работа **бібліятэкі клюбу будаўнікоў**—вядзецца **па** расійскай мове. Беларускіх кніг зусім мала.

Бібліятэка набывае літаратуру не ў магазынах БДВ, а праз кніжны калектар ЦСПСБ.

У бібліятэцы звычайна ня раяць наведвальніку тую ці іншую кніжку. **Бібліятэкар пічыць асабліва «неудобным» прапаноўваць чытачу беларускую кніжную навінку.**

Перасовачныя бібліятэкі камплектуюцца так, што, напрыклад, на пабудову Дому Ўраду трапляюць 24 беларускія кніжкі—«Веснаход» Чарота і «Адказ калгасьнікам» Сталіна, на «Эльзод»—10 кніжок, **у рабочком МБВ—ні аднае, на цагельню № 1—1 кніжка, пабудову цагельні Менбуду—ні аднае...**

У Белжылсаюз, дзе занята 1.500 рабочых, была накіравана перасоўка з 300 кніг. З іх беларускіх—26...

Попыт-жа на беларускую літаратуру з боку рабочых ёсьць.

У самым клюбе пераважная большасьць абвестак і плякатаў—на расійскай мове. На расійскай мове праводзіцца і ўся масавая работа.

Сярод шматлікіх гурткоў (кройкі і шыцьця, драматычны, музычны, радыё і фота) **няма ні аднаго, які адважыўся-б перайсьці на беларускую мову.**

Загадчык адкрыта прызнаецца:

— Языка не знаю, говорить на нем не могу...

Клюб друкароў

Хаос пануе ў **бібліятэцы клюбу друкароў.** Бібліятэкар абсалютна ня ў курсе справы, ня ведае, адкуль ў яго кнігі, колькі іх і якія...

На працягу 6 месяцаў бібліятэка не папаўнялася навейшай беларускай пралетарскай літаратурай.

Характэрна, што сярод кніжок перасоўкі, накіраванай у працалектыў капвэргнага камбінату і друкарню Акадэміі Навук, не знайшлося ні адное беларускае.

Чаго варты, скажам, такі факт, калі чытальня клюбу друкароў у летнім садзе ў вітрыну навейшае літаратуры ветліва ўстаўляе пару «навінак»: Чарвякова «Беларусь да X-е гадавіны Кастрычніка» (выданьне 1927 г.) і Чорнага «Хвоі гамоняць» выданьне 1928 году)?

Ёсьць і дадатнае. Работа клюбу (перапіска і інш.) пераведзена цалкам на беларускую мову. Быў гурток беларусазнаўства, але ён ужо некалькі месяцаў не працуе.

Нашы клюбы і бібліятэкі павінны адыгрываць вялікую ролю ў правядзеньні ленінскай нацпалітыкі, у прыватнасьці—беларусізацыі. Між тым, дагэтуль праўленьні саюзаў у першую чаргу—праўленьні клюбаў не пераключылі сваю дзейнасьць на вырашэньне гэтай задачы.

Трэба рашуча ўдарыць па галаванцкіх адносінах да прасоўваньня беларускае пралетарскае кніжкі і мастацтва ў рабочую масу, па недаацэнцы літычнага значэньня ўкараненьня беларусізацыі.

Юр. Лавонны.

Ударыць па праявах вялікадзяржаўнага шавінізму ў МЦРК і Белкаапсаюзе

У пачатку бягучага году акруговая нацкамісія рабіла абсьледваньне МЦРК і менскага аддзяленьня Белкаапсаюзу. Высьветлілася, што на расійскай мове праводзіцца ўся работа з беларускім пішуцца выключна па расійску. Акр. нацкамісія прапанавала арганізаваць пры мясцкомах і групкомах гурткі па вывучэньні беларускай мовы. А ці створаны яны цяпер пасьля 6-7 месяцаў— акруговая нацкамісія сама дакладна ня ведае.

ПА МЕНСКІМ АДДЗЯЛЕНЬНІ БЕЛКААПСАЮЗУ ЗА ІГНАРАВАНЬНЕ СПРАВЫ БЕЛАРУСІЗАЦЫІ, КАМІСІЯ ВЫНЕСЛА ПАСТАНОВУ ПРЫЦЯГНУЦЬ ЗАГАДЧЫКА ДА АДКАЗНАСЬЦІ. Аддзяленьню Белкаапсаюзу было прапанавана рашуча выправіць гэты недахоп па ўстанове і праз 3 месяцы зрабіць адпаведную справаздачу.

ПРАЙШЛІ ЎСЕ ТЭРМІНЫ, А ЗАГАДЧЫК ДА АДКАЗНАСЬЦІ НЯ ПРЫЦЯГВАЎСЯ, НЯ БЫЛО НІЯКАЙ СПРАВАЗДАЧЫ АБ РАБОЦЕ У ГАЛІНЕ БЕЛАРУСІЗАЦЫІ.

З такімі прыміўрнічымі адносінамі да супраціўленьня беларусізацыі патрэбна самая рашучая барацьба.

Л-ны.

Вякікадзяржаўныя шавіністыя дзейнічаюць

Будучы ў доме адпачынку «Чырвоны Кастрычнік» на Віцебшчыне, заходзячы ў некаторыя мясцовыя ўстановы, я суустрэўся з агіднейшымі адносінамі да беларусізацыі ня толькі з боку паасобных работнікаў, але і некаторых кіраўнікоў установаў.

У **Віцебскай** акруговай страхкасе, на маё запытаньне да работнікаў канцылярыі (якія я задаваў пабеларуску), я атрымліваў адказ толькі на расійскай мове.

— Вы, мусіць, аднекуль прыехалі?

— Чаму?—спытаўся я.

— Ды ў нас мала хто гаворыць пабеларуску...

Старшыня акрстрахкасы на маёй пацёўны ўжо налажыў рэзалюцыі: «За ведующему домом отдыха. Принять тов. Козловского безоговорочно».

Некаторыя з адпачываючых сьміяліся над беларускай мовай.

— Ты гаворыш «дом адпачынку»? сьміяўся Гольдма. Гэта ня

Адпачываючая Коткіна гаворыць, што яна працуе на беларускай пішучай машыністкай, добра мову ведае, але...

— Фу, какой этот белорусский язык некрасивый...

Другі адпачываючы—пачынаў расказваць адносна неразуменьня беларускіх слоў—брыдкія анэкдоты з нахрапнымі вялікадзяржаўным шавіністычным пахам.

Калі на разьвітальным вечары я выступіў на беларускай мове, адпачываючыя ўзьнялі [illegible]

— Чытай па расійску.

— Гаварыў па расійску.

Я дамаў, што загадчыку домам ад пачынку і сакратару мясцовай парт ячэйкі вядомы тыя асобы, якія выступ. ; адкрыта супроць беларусізацыі. Гэтыя выступленьні нельга інакш ка- ; ваць, як праявы вялікадзяржаўнага шавінізму. Н[illegible]

*) Артыкул зьмешчаны ў апошнім нумары часопісі «Большевик», які выйдзе ў бліжэйшыя дні.

В. Міцкевіч-Капсукас

Рост антысавецкай актыўнасьці Польшчы і лімітрофаў*)

Становішча на **грашовым рынку** таксама зьяўляецца вельмі цяжкім. Колькасьць апрацэтаваных вэксаляў расьце. Прыбліны процант іх дасягнуў у маі 18,8 супроць 15,5 проц. у красавіку. Зваротны скарачаюцца. Банкруцтвы растуць. Гандаль страціў крэдытаздольнасьць. Грашовыя ліпкі ў польскім банку скарачаюцца. Усё часьцей пачынаюць гаварыць аб надыходзячым крызісе польскай валюты.

Пошукі доўгатэрміновай замежнай пазыкі покуль што ня скончыліся посьпехам. Курс польскіх пазык на нью-ёркскай біржы за першую чвэрткі 1930 году панізіўся ў сярэднім да 83,86 супроць 92,06 у лістападзе 1927 г. Ён зараз ніжэй нават курсу грэцкай пазыкі і толькі на два пункты вышэй баўгарскай. Падзеньне курсу, бясспрэчна знаходзіцца ў сувязі з наўстойлівым унутраным становішчам Польшчы. Таму ёй так цяжка атрымаць доўгатэрміновую замежную пазыку, якая магла-б сваячасова крыху палепшыць яе становішча.

Падводзячы вынік сказанаму, трэба канстатаваць, **што Польшча перажывае глыбокі эканамічны крызіс, без пэрспэктыў на паляпшэньне ў бліжэйшы час, а наадварот, з пэрспэктывай на далейшае пагпыбленьне крызісу і дэградацыю сельскае гаспадаркі, якая ня выключае некаторых хістаньняў і некаторага паслабленьня тэмпу нарастаньня крызісу. Працэс загніваньня капіталістычнай стабілізацыі і росту клясавых супярэчнасьцяй зайшоў у Польшчы далей, чым у іншых эўрапэйскіх краёх.** Тыя мерапрыемствы, якія прымаюцца для паслабленьня вострасьці крызісу фашысцкім урадам, які прадстаўляе інтарэсы буйнога капіталу і паменчыкаў, пры ўсім большым звужэньні ўнутранога рынку і нарастаньні сусьветнага эканамічнага крызісу, ня далі і ня могуць даць больш, або менш грунтоўных вынікаў. Польска-нямецкі гандлёвы дагавор да гэтага часу яшчэ не ратыфікаваны, таксама не абяцае нічога добрага для Польшчы. Пры ўвядзеньні ў Нямеччыне высокіх мытніцкіх пошлін на прадукты сельскае гаспадаркі нічога грунтоўнага ня можа выйграць ад яго нават сельская гаспадарка Польшчы. Між тым, ён адчыняе дзьверы ў Польшчу для нямецкай прамысловасьці і ставіць над сур'ёзную нагрозу польскую лёгкую прамысловасьць.

Усе цяжкасьці вынікаў крызісу буржуазія імкнецца перакласьці на плечы працоўных мас. Ідзе новая хваля капіталістычнай рацыяналізацыі вытворчасьці, скарачэньне заработнай платы, павялічэньне рабочага дня, увядзеньне фашысцкай рэгламэнтацыі працы, штрафаў і інш., падатковыя экзэкуцыі ў вёсцы, продаж з малатка маемасьці сялян за няўплату процантаў па даўгох (запазычанасьць сялян надзвычайна ўзрасла ня толькі ў банках, але яшчэ больш у прыватных ліхвяроў). Яшчэ больш узмацняецца фашысцкі тэрор супроць працоўных мас і прыгнечаных нацыянальнасьцяй. Надзвычай абвастраюцца клясавыя супярэчнасьці.

У выніку гэтага расьце вялікае незадаваленьне ў горадзе і ў вёсцы, узмацняецца рэвалюцыйны ўздым і ўплыў кампартыі, растуць рэвалюцыйныя выступленьні рабочае клясы пад кіраўніцтвам кампартыі. Асабліваю актыўнасьць і ўпартасьць у барацьбе праявілі беспрацоўныя ў правінцыі, дзе яны яшчэ менш забясьпечаны, чым у цэнтры. Ня гледзячы на эканамічны крызіс, паднімаецца хваля забастовак. Сярод сялян, даведзеных да поўнага разарэньня, разьвіваецца стыхійны антынадатковы рух, які ў некаторых мясцох прыняў шырокія разьмеры. Нават міністар фінансаў Матушэўскі загаварыў аб «антыпадатковым псыхозе» сялян. Незадаваленьне ўсё больш праскае і ў асяродзьдзе гарадзкой дробнай і нават сярэдняй буржуазіі. На гэтай глебе мы мелі ў многіх мясцох мітынгі-пратэсты гандляроў супроць цяжкасьці падаткаў і дзе-ні-дзе нават сваеасаблівыя іх забастоўкі, якія выявіліся ў зачыненьні крам.

Пры гэтым ідзе, бясспрэчна, звужэньне базы польскага кіруючага фашызму і павольнае, але няўхільнае расхістваньне яго магутнасьці (у параўнаньні з першымі гадамі фашысцкай дыктатуры ў Польшчы). Ён, бясспрэчна, усё больш пазбаўляецца падтрыманьня ня толькі сярод рабочых мас, але сярод асноўнай сялянскай масы і нават сярод гарадзкой дробнай і сярэдняй буржуазіі, якая раней амаль поўнасьцю яго падтрымлівала. Аб гэтым звужэньні базы пілсудчыкаў гаворыць і выбары, якія адбыліся ў розных мясцох Польшчы. Нарэшце, каб не дыскрэдытаваць сябе, так званы «Беспартыйны блёк» пілсудчыкаў зусім адмовіўся ад выстаўленьня на выбарах сваіх сьпісаў. Наадварот, сярод гарадзкой дробнай і сярэдняй буржуазіі вельмі павялічваецца ўплыў эндэкаў, якія зьяўляюцца ня меншымі фашыстымі, чым пілсудчыкі, але якія іграюць у рэзкую апазыцыю да дыктатуры Пілсудзкага. У вёсцы вельмі павялічваецца ўплыў тых народна-фашысцкіх партый, якія асабліва моцна прыбягаюць да «левай», радыкальнай фразы (сялянская партыя, украінская радыкальная партыя і інш.). Аб гэтым сьведчаць асабліва выразна апошнія выбары ў Сандаміры, Заходняй Украіне, Заходняй Беларусі. Адтак, буйны капітал і памешчыкі да гэтага часу бачаць у кіруючай фашысцкай групе лепшага выказьніка і абаронцу сваіх інтарэсаў і поўнасьцю яе падтрымліваюць. Дыктатуру Пілсудзкага падтрымлівае таксама армія; у яго руках дзяржапарат. Сусьветны імпэрыялізм, бачачы ў гэтай групе лепшую аброю для барацьбы супроць СССР, таксама падтрымліває яе. Гэта яшчэ дае магчымасьць фашысцкай дыктатуры пілсудчыкаў кіраваць, ня гледзячы на звужэньне іх сацыяльнай базы, моцныя супярэчнасьці ў лягеры польскага фашызму, ня гледзячы нават на супярэчнасьці ў самім лягеры пілсудчыкаў і адыход ад іх некаторых груп (адыход групы радыкала Станішкага, канцэрвэратара Дзячкоўскага, народніка Курэльскага, адыход былога міністра Чэховіча, вострыя выступленьні газэты пілсудчыкаў «Пяхолому» аб разлажэньні ўрадавага абозу і інш.), ня гледзячы, нарэшце, на праяўленьне некаторых аднакаў разлажэньня ў армії, дзяржапараце, «Стрэльцы». Словам, у Польшчы **ўсё больш нарастаюць элементы агульнапалітычнага крызісу.**

Пры такім абвастрэньні крызісу Польшча і лімітрофы ўсё больш становяцца на той пункт погляду, што лепшым сродкам выхаду з цяжкага эканамічнага крызісу і насьпяваючага агульна-палітычнага крызісу зьяўляецца вайна супроць СССР. Да ёе шалёна рыхтуецца «палкоўніцкі» ўрад Польшчы са Славэкам на чале. Аб гэтым сьведчыць ня толькі шалёнае цкаваньне супроць СССР і падрыхтоўка правакацыйнага замаху на паўнамоцнае прадстаўніцтва СССР, ня толькі той факт, што, ня гледзячы на глыбокі эканамічны крызіс у польскай прамысловасьці, фабрыкі, якія працуюць на вайну, сьпешна рэарганізуюцца і яшчэ працуюць з поўнай нагрузкай, і што ідзе ўзмоцнены прывоз у Польшчу з Францыі танкаў, аэраплянаў, хэмічных сродкаў і інш., але і выкрыцьцё ў апошні час польска-нетлюраўскія і польска-ўнідаўскія згоды (УНДА — Украінскае нацыянальна-дэмакратычнае аб'яднаньне), а таксама актыўнейшая работа польскай дыплёматы і генэральнага штабу на стварэньні адзінага антысавецкага фронту ад Ледавітага акіяну да Чорнага мора. Абвяржэньні польскіх афіцыёзаў адносна польска-украінскае згоды нікога не пераканалі. Наступныя факты, наадварот, п

МАЦНЕЙ УДАР ПА КУЛАКУ

Посьпехі перадавых калгасаў, якія па-бальшавіцку ўбіраюць ураджай і рыхтуюцца да асеньняй сяўбы, выклікаюць новы прыліў бядняцка-серадняцкіх мас індывідуальнікаў у калектывы, б'юць па кулацтве і яго праваапартуністычнай агентуры

Прарывы ў Чарэйскім, Жыткавіцкім і Горацкім раёнах—вынік права-апартуністычнай практыкі мясцовага кіраўніцтва. Чарэйскія раённыя кіраўнікі замест упартай барацьбы за замацаваньне калгасаў, узялі праваапартуністычную стаўку на самацёк, ня далі адпору клясаваму ворагу

Супроць праваапартуністычнай стаўкі на самацёк

Партыя дабілася рашаючых посьпехаў на фронце калгаснага будаўніцтва. Наперакор крусам і манаверам з праваага пляжу, разгортваючы бязьлітаснае наступленьне на кулака, бальшавіцкая партыя з посьпехам ажыцьцяўляе ленінскую праграму сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі на аснове калектывізацыі. Вясной першая калгасная сяўба выразна давяла правільнасьць лініі партыі на калектывізацыю вёскі і нанесла руйнуючы ўдар па кулаку і яго праваапартуністычнай агентуры.

Зараз перад намі стаяць вялікія задачы па замацаваньні існуючых калгасаў і далейшым разгортваньні калектывізацыі. Правёўшы баявым тэмпам першую веснавую калгасную сяўбу, мы павінны таксама па-бальшавіцку правесьці ўборачную і асеньнюю пасеўную кампаніі і забясьпечыць правільнае вырашэньне задач, зьвязаных з разьмеркаваньнем прыбыткаў і ўраджаю ў калгасах. На гэтым адказнейшым этапе каўктывізацыі патрэбна максымальная мабілізацыя ўсіх сіл. Кулацтва ўсякім спосабам прабуе дэзарганізаваць уборачны фронт. Купакі разгортваюць шапёную антыкалгасную прапаганду, пускаючы ў ход усе сродкі ад адкрытага тэрору да замаскаванай падрыўной работы.

Кожная партыйная арганізацыя павінна своячасова арганізаваць адпор батрацкіх і бядняцка-серадняцкіх мас узьнімаючаму галаву кулацтву. Партыйныя ячэйкі павінны з усёй бальшавіцкай упартасьцю змагацца за хутчэйшую ўдарную ўборку ўраджаю, за баявую падрыхтоўку да асеньняй пасеўнай кампаніі.

Там, дзе партыйныя арганізацыі на справе ўзяліся за ажыцьцяўленьне гэтых задач, мы бачым, што ўборачная кампанія праходзіць з вялікім посьпехам, што калгасы, паказваючы баявыя тэмпы ўборкі, на практыцы даводзяць перавагу калектыўнае гаспадаркі над індывідуальнай. Ва многіх раёнах Бабруйшчыны і Магілеўшчыны, напрыклад, дзе калгасныя партыйныя ячэйкі своячасова арганізавалі падрыхтоўку да ўборкі, своячасова мабілізавалі калгасную масу вакол задач уборачнай і асеньняй пасеўнай кампаній, індывідуальнікі пад уплывам посьпехаў перадавых калгасаў яднаюцца ў калектывы. Тут ударная ўборка ўраджаю, арганізаваная праца калгасаў і працоўны энтузіязм калгасьнікаў выклікаюць новы масавы прыліў. У Клімавіцкім, Жлобінскім і іншых раёнах цэлыя вёскі ўступаюць ў калектывы, ухваляюць прыкладны статут с.-г. арцелі і разгортваюць падрыхтоўку да асеньняй сяўбы. У Магілеўшчыне, як нам паведамляюць, за адну тоньку другую дэкаду арганізавана 13 новых калгасаў, якія аб'ядналі некалькі сот індывідуальных бядняцка - серадняцкіх гаспадарак.

Гэтыя посьпехі даманструюць рост калгаснага будаўніцтва. Яны служаць магутным стымулам да далейшага разьвіцьця калгасаў, да новага прыцёку батрацка-бядняцка-серадняцкіх мас у калектывы, яны наносяць бязьлітасны ўдар па кулаку і яго агентах — правых апартуністых. Але адначасова трэба з усёй рашучасьцю адзначыць, што ў асобных мясцох маюць месца пэўныя прарывы.

У гэтых адносінах заслугоўваюць самай сур'ёзнай увагі матар'ялы з Чарэйскага, Жыткавіцкага і Горацкага раёнаў, зьмешчаныя ніжэй. Яны сыгналізуюць аб тым, што ў гэтых раёнах некаторыя калгасы стаяць на парозе развалу, што тут зауважаецца пэўны часткові адліў. Чаму? Дзе прычыны адліву, які мае месца ў некаторых калгасах Горацкага Жыткавіцкага і Чарэйскага раёнаў? На гэта пытаньне лепшы адказ даюць самі матар'ялы.

Практыка Чарэйскага раённага партыкіраўніцтва выразна паказвае куды прыводзіць праваапартуністычная стаўка на самацёк, прымірэнцтва да клясавага ворага, кулака. Чарэйскія раённыя кіраўнікі, на радасьць кулаку, пальцам не паварушылі, каб хаця-б што небудзь зрабіць па замацаваньні існуючых калгасаў, каб аказаць калгасьнікам практычную дапамогу і г. д. Кулацкія элементы ў раёне разгортвалі шалёную агітацыю супроць калгасаў, кулакі і сэктанты пранізілі ў калгасы, каб весьці там шкодніцкую падрыўную работу, а раённае партыйнае кіраўніцтва спадзявалася на самацёк, прадаставіла калгасам ёлькі, якія добраахвотна аб'ядналіся ў калгасы, але ня мелі патрэбнага вопыту для вядзеньня калектыўнае гаспадаркі, чакалі кіраўніцтва і практычнай дапамогі. Раённыя ўстановы на гэта не зьвярнулі ніякай увагі. Няхай сабе робяць, што хочуць, няхай сабе вядуць гаспадарку як могуць.

Ня маючы патрэбных кіраўнікоў, не атрымліваючы ніякай кіраўнічай дапамогі найбольш слабыя калгасы ў Чарэйшчыне, зразумела, ня здолелі вырашыць пытаньняў арганізацыі працы, аплаты, правільнай пастаноўкі гаспадаркі і г. д., і т. п. У выніку ў асобных калгасах пануе безгаспадарчасьць, яны не падрыхтаваны да ўборачнай кампаніі, да асеньняй сяўбы і г. д. Чарэйскім калгасьнікам ніхто не растлумачыў, што ім дасьць калгас, яны ня ведаюць як разьмяркоўваць ураджай, а раённая партарганізацыя нічога не зрабіла, каб прыйсьці калгасьнікам на дапамогу. І скаргі калгасьнікаў з арцелі «ЧЫРВОНЫ АРАТЫ», што «мы ня ведаем за што працуем, нам ніхто ня цікавіцца» гучаць як абвінавачэньні прыгавар раённаму партыкіраўніцтву. Натуральна, што ў некаторых калгасах пачаўся адліў у чым значную ролю адыграў кулак, які бесьперашкодна разгортваў сваю супроцькалгасную прапаганду. І чарэйскія кіраўнікі сваёй злачынной бязьдзейнасьцю аб'ектыўна дапамаглі кулаку ў яго контр-рэвалюцыйнай справе. Зусім ясна, што развал некаторых калгасаў у Чарэйшчыне, галоўным чынам, тлумачыцца тым, што кіраўніцтва раённай партарганізацыі праводзіла выразную лінію правага апартунізму на практыцы, што яно лібэральна адносіцца да кулака, што яно ігнаруе інтарэсы калгасаў і не займаецца актуальнейшымі пытаньнямі калгаснага будаўніцтва. Як трэба кваліфікаваць абурачыя адносіны сакратара Чарэйскага райкому партыі да калгасьнікаў, як ня простую дапамогу клясаваму ворагу.

Побач з праваапартуністычнай практыкай, у асобных мясцох мы заўважаем «лявацкія» настроі. Аб гэтым выразна сьведчыць заява старшыні Горацкага райкалгасаюзу, які ўпэўнен, што «без перагібаў уборачнай кампаніі не правядзеш».

Зусім відавочна вялізарная віна, якая падае на калгасна-каапэрацыйную сыстэму Жыткавіцкага, Горацкага і Чарэйскага раёнаў. Райкалгасаюзы і райпаляводсаюзы гэтых раёнаў сваёй абурачой бязьдзейнасьцю правальваюць уборачную кампанію і спрыяюць частковаму развалу асобных калгасаў. Карэспандэнцыя з Воршы, зьмешчаная ў сёньнішнім нумары «Зьвязды» выразна паказвае да якіх разьмераў даходзіць бязьдзейнасьць Горацкага райкалгасаюзу. Гэта бязьдзейнасьць перарасла ў практыку выразнага правага апартунізму. Калгасаюз спакойна дапускае ліквідацыю цэлага калгасу, ніяк не рэагуе на развал двух калгасаў у раёне, зусім ня кіруе ўборачнай кампаніяй і г. д. Хіба такая бязьдзейнасьць Горацкага райкалгасаюзу ня ёсьць аб'ектыўна дапамога клясаваму ворагу, кулаку? А чаго варты Чарэйскі райвыканком і райпаляводсаюз, якія бюракратычна ігнаруюць усе просьбы калгасаў аб дапамозе? Калгасьнікі просяць райвыканком дапамагчы ім замацаваць калгасы і наладзіць калектыўную гаспадарку, а бюракраты з райвыканкому проста не аказваюць на гэтыя просьбы. Такіх работнікаў трэба прыцягваць да самай суровай адказнасьці. Бясспрэчна апарат калгасна-каапэрацыйнай сыстэмы і ў першую чаргу яго кіраўніцтва ў Жыткавіцкім, Горацкім і Чарэйскім раёнах патрабуе карэннага аздараўленьня. Апартуністых трэба зьняць з пастоў.

Прычыны адліву з калгасаў, які мае месца ў Жыткавіцкім раёне, а таксама і ў Горацкім такія-ж, як і на Чарэйшчыне. Яны заключаюцца ў асноўным ў тым, што раённае партыйнае кіраўніцтва замест барацьбы за ЗАМАЦАВАНЬНЕ калгасаў, за іх АРГАНІЗАЦЫЙНА-ГАСПАДАРЧЫ рост, за НАЙШЫРЭЙШУЮ РАСТЛУМАЧАЛЬНУЮ РАБОТУ сярод калгасных мас, замест БЯЗЬЛІТАСНАГА АДПОРУ КУЛАКУ ўзяло ПРАВААПАРТУНІСТЫЧНУЮ СТАЎКУ НА САМАЦЁК, СПАЗУЛО Ў БАЛОТА ПРАВАГА АПАРТУНІЗМУ. Такое кіраўніцтва бясспрэчна, павінна быць НЕАДКЛАДНА ЗЬМЕНЕНА.

РАЗГОРТВАНЬНЕМ МАСАВАЙ РАБОТЫ СЯРОД КАЛГАСНЫХ МАС, УДАРНЫМ ПРАВЯДЗЕНЬНЕМ УБОРАЧНАЙ І АСЕНЬНЯЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІЙ, ШЫРОКІМ РАСТЛУМАЧЭНЬНЕМ ПАСТАНОЎ ПАРТЫІ І ЎРАДУ ПА ПЫТАНЬНЯХ РАЗЬМЕРКАВАНЬНЯ ЎРАДЖАЮ, СЫСТЭМАТЫЧНАЙ ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯЙ ПАСТАНОЎ XVI ЗЬЕЗДУ УсеКП(б) СЯРОД КАЛГАСНЫХ І ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ БАТРАЦКА-БЯДНЯЦКІХ МАС — НАНЯСЕМ БЯЗЬЛІТАСНЫ ЎДАР ПА КУЛАЦТВУ І ЯГО АГЕНТАХ ПРАВЫХ АПАРТУНІСТЫХ. ГЭТА АСНОЎНАЯ ЗАДАЧА, ЯКАЯ ПАВІННА БЫЦЬ БЫКАНАНА ВА ШТО-Б ТАМ НІ СТАЛА.

Ш. Г.

Растуць новыя калгасы

Бальшавіцкая ўборка ўраджаю, выразная арганізацыя працы, правільнае разьмеркаваньне ўраджаю выклікаюць новы масавы прыліў у калектывы

ПЕРАДАВЫЯ КАЛГАСЫ **МАГІЛЕЎШЧЫНЫ І БАБРУЙШЧЫНЫ** З ПОСЬПЕХАМ КАНЧАЮЦЬ УБОРКУ ЎРАДЖАЮ. ШЛЯХАМ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА, УДАРНЫЯ БРЫГАДЫ КАЛГАСЬНІКАЎ НА ПАЛЕХ ЗНАЧНА РАНЕЙ ТЭРМІНУ КАНЧАЮЦЬ УБОРКУ ЎРАДЖАЮ, ПАД УПЛЫВАМ ПОСЬПЕХАЎ ПЕРАДАВЫХ КАЛГАСАЎ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІЯ МАСЫ ІНДЫВІДУАЛЬНІКАЎ ІДУЦЬ У КАЛЕКТЫВЫ.

НА **КЛІМАЎШЧЫНЕ** ЎСЯ ВЁСКА **ХАДЗЕЕЎКА** ПАДАЛА КАЛЕКТЫЎНУЮ ЗАЯВУ АБ УСТУПЛЕНЬНІ Ў КАЛГАС. У ІНШЫЯ КАЛГАСЫ КЛІМАЎШЧЫНЫ ЗА АПОШНІЯ ДНІ ЎЛІЛОСЯ ЗВЫШ 100 БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК.

У КАЛГАСЫ **ГЛУСКАГА** РАЁНУ ПАДАНА ЗВЫШ 50 ЗАЯЎ. У КАЛГАС ІМЯ 12-ГОДЗЬДЗЯ КАСТРЫЧНІЦКАЙ РЭВАЛЮЦЫІ, НАПРЫКЛАД, УСТУПІЛА 12 БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК. МАСАВЫ ПРЫЛІЎ МАЕ МЕСЦА Ў ЖЛОБІНСКІМ РАЁНЕ. НА ПОЛАЧЧЫНЕ Ў КАЛГАСЫ **«НОВЫ ШЛЯХ»**, ІМЯ **ЛЕНІНА** І **«ЧЫРВОНЫ КАСТРЫЧНІК»** КОЖНЫ ДЗЕНЬ ПАДАЮЦЦА ЎСЁ НОВЫЯ ЗАЯВЫ АБ ЖАДАНЬНІ ЎСТУПІЦЬ У КАЛГАС.

У КАЛГАСЫ ТАЛОЧЫНСКАГА РАЁНУ ЗА НЕКАЛЬКІ ДЗЁН УСТУПІЛА ЗВЫШ 30 БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК. НА МАЗЫРШЧЫНЕ Ў КАЛІНКАВІЦКІМ РАЁНЕ АРГАНІЗАВАЎСЯ **НОВЫ КАЛГАС.** ПРЫЦЁК ЗАЯЎ НЯ СПЫНЯЕЦЦА. НА МАГІЛЕЎШЧЫНЕ, НАПРЫКЛАД, ЗА АДНУ ТОЛЬКІ ДРУГУЮ ДЭКАДУ ЛІПЕНЯ АРГАНІЗАВАНА **13 НОВЫХ КАЛГАСАЎ**, ЯКІЯ ЯДНАЮЦЬ СОТНІ ІНДЫВІДУАЛЬНЫХ БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКІХ ГАСПАДАРАК. НОВЫЯ КАЛГАСЫ АДНАДУШНА ЎХВАЛЯЮЦЬ СТАТУТ С.-Г. АРЦЕЛІ І РЫХТУЮЦЦА ДА АСЕНЬНЯЙ ПАСЕЎНАЙ КАМПАНІІ.

Балянс апартуністычнай практыкі

ЖЫТКАВІЦКАЕ РАЁННАЕ КІРАЎНІЦТВА СПАДЗЯЕЦЦА НА САМАЦЁК

Перагібы, якія мелі месца ў **ЖЫТКАВІЦКІМ** раёне (Мазыршчына) **НЯ БЫЛІ ЎЛІЧАНЫ** мясцовымі арганізацыямі. Кіраўнікі райкому партыі і райвыканкому **АПУСЬЦІЛІ РУКІ** і прадаставілі калгасам плыць па волі хваль.

Тымчасам кулацтва ўзьняла галаву. Яно павяло шалёную агітацыю супроць калгасаў. У выніку поўнай бязьдзейнасьці раённых устаноў і актыўнай кулацкай агітацыі ў некаторых калгасах заўважваецца **АДЛІЎ.**

Калгас **«НОВАЛЕНІНА»**, напрыклад, амаль зусім разваліўся. І гэта ня дзіўна. У калгасе ня было ніякай масавай палітычнай і гаспадарчай работы. Калгас быў пазбаўлен усякай кіраўнічай дапамогі.

У праўленьне калгасу «НОВАЕ ЖЫЦЬЦЁ» прапезьлі падкулачнікі, якія адкрыта агітуюць батракоў за выхад з калектыву. Гэтыя падкулачнікі дайшлі да таго, што нават не давалі батракам хлеба.

Член праўленьня калгасу **ГАРБУЗ** прымушаў калгасьнікаў і сялянскую беднату даць подпісы пад заявай аб звароце сваякоў Гарбуза—кулакоў, высланых за межы **БССР.** Калі старшыня сельсавету адмовіўся заверыць гэтыя, эманам і прымусам, здабытыя подпісы, дык Гарбуз заявіў:

— Калі подпісы ня будуць завераны, дык калгас праз некалькі дзён разваліцца.

Спалоханы старшыня заверыў на заяве кулацкага агента. Як рэагавалі партыйная і камсамольская ячэйкі на гэты абураючы факт? НІЯК. Асобныя партыйныя ячэйкі ў Жыткавіцкім раёне не даюць ніякага адпору кулацкім элементам, якія шалёна прабуюць разваліць калгасы. **ПРЫМІРЭНЧА** адносяцца да кулацкай дзейнасьці гэтыя ячэйкі не аказваюць НІЯКАЙ дапамогі калгасам і спадзяюцца на САМАЦЁК. Ня дзіва, што за апошні час у раёне некалькі дзесяткаў серадняцкіх і нават батрацкіх і бядняцкіх гаспадарак выйшлі з калгасаў. ТАКІ БАЛЯНС ПРАВААПАРТУНІСТЫЧНАЙ СТАЎКІ НА САМАЦЁК, ЯКУЮ ЎЗЯЛО ЖЫТКАВІЦКАЕ РАЁННАЕ ПАРТЫЙНАЕ КІРАЎНІЦТВА.

КУРГАН.

Стаўка на... адміністраваньне

ГОРКІ, 2. (Спэц. брыгада). Горацкі райкалгасаюз правальвае ўборачную кампанію ў раёне.

Плян уборачнай кампаніі **не даведзены** да паасобнага калгасу. Большасьць калгасаў **не зямляўпарадкавана.** Індывідуальны сэктар зусім выпаў з-пад увагі горацкіх раённых устаноў. Пры адводзе сенажаці былі груба парушаны інтарэсы індывідуальнікаў. У вёсцы **Уляшыне, Захарэвічах** і інш., напрыклад індывідуальнікам сенажаць амаль зусім ня была адведзена.

Райвыканком і райкалгасаюз не цікавяцца становішчам калгасаў. Паміж калгасамі і былымі калгасьнікамі, якія выйшлі з калектыву на глебе разьмеркаваньня азімага кліну ў некаторых месцах узьніклі сур'ёзныя канфлікты. Ні райвыканком, ні райкалгасаюз нічога не зрабілі, каб урэгуляваць гэтыя канфлікты.

Уборка ўраджаю і падрыхтоўка да асеньняй засеўнай кампаніі праходзіць **самацёкам.** Райкалгасаюз стаіць у баку ад уборачнай кампаніі. Старшыня райкалгасаюзу лічыць, што ніякай масавай работы сярод батрацкіх і бядняцка-серадняцкіх мас праводзіць ня трэба. Ён глыбока пераконаны, што «без адміністраваньня ўборачнай і засеўнай кампаніі правесьці нельга».

— «Бяз міліцыі ўсё роўна не абайдзіцца», — разважае гэты старшыня.

Усе работнікі райкалгасаюзу амаль увесь час сядзяць у сваіх габінэтах і ня бываюць у калгасах. РКС знаходзіцца ў палоне **самацёку.** Ня дзіва, што паасобныя калгасы, пазбаўленыя ўсякай дапамогі і кіраўніцтва стаяць па парозе развалу. За апошні час, напрыклад, разваліліся калгасы **«Чырвоны асьветнік»** і **«Новы сьвет».**

Член партыі **Сафронаў**, старшыня куставога калгаснага аб'яднаньня ў адной вёсцы распусьціў калгас. Маемасьць калгасу, набытую шляхам крэдытаваньня Сафронаў раздаў сваім сваякам. Ні райком партыі, ні райвыканком, ні райкалгасаюз **не рэагавалі** як належыць на гэты агідны факт.

Р—н.

Больш сувязі, больш дапамогі 25-цітысячнікам!

Пастанова прэзыдыуму ЦКК КП(б)Б

Прэзыдыум ЦКК КП(б)В і калегія РСІ БССР заслухалі даклад тав. **Каршакевіча** аб выніках абсьледваньня становішча 25-цітысячнікаў.

Прэзыдыум ЦКК і калегія РСІ адзначылі, што пастанова партыйных, прафэсыянальных і савецкіх арганізацый аб мабілізацыі 25-ці тысяч рабочых для ўзмацненьня калектывізацыі і сацыялістычнай рэканструкцыі сельскае гаспадаркі **слабе поўнасьцю апраўдала.** Гэта пастанова знайшла жывы водгук сярод рабочай клясы БССР—замест вызначаных 500 чалавек, было падана заяў больш як ад 1.300 рабочых-добраахвотнікаў. Склад пасланых 534 чалавек, у асноўным, быў зусім адавальняючы. Пераважная большасьць мае вытворчы стаж звыш 5 год.

25-цітысячнікі ў асноўным скарыстаны ў адпаведнасьці з партыйнымі дырэктывамі. **Ня гледзячы на тое, што 25-цітысячнікі былі пасланы ў вёску ў момант жорсткага клясавага змаганьня, ва ўмовах слабай дапамогі з боку фабрычна-заводзкіх арганізацый — яны справіліся з усклядзенымі на іх задачамі.** Пераважная большасьць 25-цітысячнікаў, якія працуюць у калгасах, атрымалі здавальняючыя водгукі як ад калгасьнікаў, так і мясцовых арганізацый.

У пастанове прэзыдыуму ЦКК і калегіі НК РСІ адзначана, што многія 25-цітысячнікі скарыстаны не па прызначэньні — замест работы ў калгасным сыстэме, яны скарыстоўваюцца ў якасьці загадчыкаў хат-чытальняў, інструктароў па рабоце сярод беднаты, на тэхнічных пасадах у спажывецкай каапэрацыі, а то і проста залічаліся ў члены калгасу.

Рад прадпрыемстваў, мясцовых партыйных і прафэсыянальных арганізацый, а таксама некаторыя цэнтральныя праўленьні саюзаў не падтрымлівалі ніякай сувязі з вылучэнцамі — 25-цітысячнікамі, не дапамагалі ім і іх сем'ям, фармальна і няўважліва адносіліся да іх лістоў і заяў. Мясцовыя партыйныя і савецкія арганізацыі, а таксама калгасна-каапэрацыйныя установы не аддавалі належнай увагі пытаньням матар'яльнага забясьпечэньня 25-цітысячнікаў і палепшэньню іх бытавых умоў.

Прэзыдыум ЦКК і калегія НК РСІ прапанавалі Наркамзему, калгасна-каапэрацыйнай сыстэме і ЦСПСВ: дабіцца правільнага скарыстаньня 25-цітысячнікаў на кіруючай рабоце ў калгасным сыстэме, катэгарычна забараняючы скарыстаньне іх на іншай рабоце; прыняць меры да ўзьняцьця кваліфікацыі 25-цітысячнікаў шляхам арганізацыі курсаў і экскурсій у пешыя саўгасы і калгасы, прыняць меры да забясьпечэньня 25-цітысячнікаў кватэрамі, харчаваньнем, зарплатай і інш.

ЦСПСВ, Калгасцэнтру і Наркамзему запрапанавана ў мэтах устанаўленьня сыстэматычнай сувязі з 25-цітысячнікамі, арганізаваць кансультацыйнае бюро пры ЦСПСВ. Перадвыборныя сходы, якія скліканцца кампартыяй, надзяртаюцца [illegible] палітычных [illegible] на ўсіх рабочых уведзен скарочан[illegible] заводу Крупа для 10.000 з 15.000 за[illegible] пятых на іх рабочых уведзен скарочан[illegible]

Кулаку на выгаду

У **Чарэйскім** раёне (**Аршаншчына**) некаторыя калгасы стаяць на парозе развалу. У раёне пачаўся часткові выхад з калектываў. Чым гэта тлумачыцца?

Чарэйскае партыйнае і савецкае кіраўніцтва пасьля веснавой кампаніі парашыла, што яно можа адпачыць на дасягнутых посьпехах. Раённая партарганізацыя, мясцовыя і зямельна-каапэрацыйныя калгасныя органы зусім ня цікавіліся становішчам калгасаў. Калгасы былі прадастаўлены самім сабе. Між тым, некаторыя маладыя калгасы ня былі гаспадарча замацаваны і ня мелі вопытных кіраўнікоў і кваліфікаваных работнікаў. Натуральна, што не атрымліваючы ніякай практычнай дапамогі, яны ня здолелі, як трэба падрыхтавацца да ўборачнай кампаніі і наладзіць калектыўную гаспадаркі. Кулацкія элементы скарыстоўвалі бязьдзейнасьць мясцовых арганізацый і павялі шкодніцкую дэзарганізатарскую работу.

Разваліўся калгас **«Шлях Селяніна»**, арганізаваны ў 1928 годзе. У гэтым калектыве вастаўся толькі адзін член — старшыня калгасу. Калгас «Шлях Селяніна» разбураны кулацтвам. На вачох у Гілянскага сельсавету і партыйнай ячэйкі («Шлях Селяніна» таксама знаходзіцца на тэрыторыі Гілянскага сельсавету) кулак Маеўскі бесперашкодна вёў антыкалгасную шкодніцкую работу Маеўскі спайваў найбольш адсталую частку калгасьнікаў, настройваў іх супроць калгаснага руху. Несьвядомых калгасьнікаў Маеўскі запэўняў, што, калі калгас разваліцца, дык яны атрымаюць усю лепшую зямлю.

Як Гілянскі сельсавет змагаўся з кулакамі, якія адкрыта праводзілі свае контр-рэвалюцыйную падрыўную работу? У адказ падамо адзін характэрны факт. Кулаку Маеўскаму аказваецца сельсавет пры патураньні мясцовай ячэйкі адвёў вучастак з калгаснай зямлі, а беднякоў-індывідуальнікаў зусім пакінуў без зямлі.

Напярэдадні развалу стаіць калгас «Працаўнік». Старшыня калгасу, падпаўлны пад уплыў кулакоў Дамбровых давёў калектыў да фактычнага развалу. Кулакі амаль разбурылі калгас, не атрымаўшы ніякага адпору.

Не зважаючы ніякай увагі на маладыя новыя калгасы, раённыя установы з наменшай пагардай адносяцца і да больш менш старых калгасаў. Райком партыі, райвыканком, раённыя калгасна-каапэрацыйныя органы махнулі рукой на гэтыя калгасы, зусім ня цікавячыся гаспадарчым і маральным становішчам калектываў. Між тым, асобныя старыя калгасы знаходзяцца ў трывожным становішчы, напрыклад, калгас **«Воля»**, які арганізаваны ў 1928 годзе і мае каля 400 гэкт. зямлі, трактар, паравы млын, добрую маемасьць і г. д. Калектыў наогул быў моцным. Але адсутнасьць патрэбнай дапамогі і ўсякага кіраўніцтва з боку раённых арганізацый жорстка б'е па гаспадарчым становішчы калгасу. Гаспадарка вядзецца дрэнна. Усе будынкі запушчаны. Машыннае аддзяленьне млыну знаходзіцца ў хаатычным становішчы. Да ўборкі ўраджаю і асеньняй пасеўнай кампаніі калгас не падрыхтаваўся. Старшыня калгасу амаль нічога ня робіць і фактычна толькі тармозіць работу калгасу. Вось чаму ў гэтым калгасе няма ніякага прыліву.

Ня лепш працуе і калгас **«Чырвоны Араты»**. Калгасьнікі гэтай арцелі кажуць:

— Мы ня ведаем, за што працуем. Ніхто нашым жыцьцём зусім ня цікавіцца.

Есьць буйныя недахопы і прарывы і ў нацыянальных калгасах **«Найер Вэг»** і **«Ройтэ Арбайтэр»**.

Паданыя прыклады з усёй выразнасьцю сьведчаць, куды прыводзіць праваапартуністычная стаўка чарэйскага раённага кіраўніцтва на самацёк. Раённае кіраўніцтва не заўважвае вынікаў сваёй злачынной бязьдзейнасьці і ня прымае рашучых мер да выпраўленьня становішча, якое стварылася.

Для характарыстыкі паводзін раённага кіраўніцтва даволі падаць напрыклад, такі факт. Нядаўна адзін старшыня калгасу папрасіў сакратара райкому партыі т. **Галавіцкага** дапамагчы рабоце калгасу, дапамагчы замацаваць калектыў. Ён пачуў наступны адказ:

— Чорт з ім, з вашым калгасам, адным калгасам будзе менш у раёне і толькі...

І ўсякі раз, калі калгасьнікі зварачаюцца да яго з просьбамі аб дапамозе, гэты апартуністы сьпяшаецца, як-небудзь хутэй ад іх адчапіцца і ніколі ня дасьць патрэбнага адказу, ня дасьць ніякай дапамогі, ніякай парады. Гэта дэмаралізуюча ўплывае на калгасьнікаў, якія знаходзяцца ў калгасах на кіраўнічай рабоце. Сьледам за сакратаром райкому асобныя члены партыі таксама махнулі рукой на калгасы і пачалі выходзіць з калектываў. Член партыі **Купікоўская** на агульным сходзе калгасьнікаў арцелі «Колас» заявіла:

— Выключэце мяне з калгасу, бо я ўсё-роўна ў ім нічога не раблю. І сама запісала сваё прозьвішча ў лік выключаных.

Член партыі **Юхновіч**, які кіруе калгасам дапускае развал калектыву. Ніякіх мер, каб папярэдзіць развал калгасу Юхновіч ня прымае. Наадварот, ён адкрыта разважае так:

— Ну што-ж з таго, што калгас разваліцца, рэвалюцыя ад гэтага не пацерпіць.

Сакратар партыйнай ячэйкі **Пятніцкі** на агульным сходзе калгасьнікаў арцелі **«Новае жыцьцё»** заявіў:

— Мне ваш калгас нічога не дае і ён мне не патрэбен. Не жадаю быць у калгасе.

Зусім ясна, што раённае партыйнае кіраўніцтва, якое пальцам не паварушыла, каб замацаваць калгасы, каб даць адпор падрыўной кулацкай дзейнасьці, каб дапамагчы калгасьнікам у іх рабоце, — спаўзло з лініі партыі на рэйкі правага апартунізму. Такое кіраўніцтва павінна быць рашуча аздароўлена.

А. Н.

Поўная бязьдзейнасьць

Уборка ўраджаю у **Межанскім** раёне ўжо распачалася. Хутка пачнецца жніво. Але райкалгасаюз не падрыхтаваўся да гэтай работы. Пытаньне аб правільным разьмеркаваньні сельска-гаспадарчых машын і інвэнтару не урэгулявана. Райпаляводсаюз ня мае пэўных вестак аб патрэбнасьці калгасаў у сельска-гаспадарчых машынах і частках да іх. У калгасе «Чырвоная Зара» ёсьць касілка, але яна на працы ня выкарыстоўваецца, бо яе не пасьпелі адрамантаваць. Плугі, якія дасланы шэфамі больш месяца ляжалі на чыгуначнай станцыі. Дырэктывы вышэйшых органаў аб арганізацыі курсаў машынаназнаўства не ажыцьцяўляюцца. Калгасныя кузьні не працуюць. Склады патрабуюць рамонту.

Супроцьпажарная ахова не ўзмацняецца. У раёне ёсьць вольныя памяшканьні, якія магчыма скарыстаць для ссыпкі збожжа, але аб гэтым ніхто ня думае.

Малышаў, Лапкоўскі і Паньнікаў.

Бюракратычнае роўнадушша

ВІЦЕБСК. Да ўборкі ўраджаю ўжо прыступлена. Ня гледзячы на гэта паляводсаюз, як паведамляюць т.т. Скараходаў, Лук'яновіч і Іванова, яшчэ ня выпрацаваў плану ўборачнай кампаніі.

Яшчэ і да гэтага часу не атрымана 340 вагонаў угнаеньня. Ня прыняты крокі да забясьпячэньня калгасаў машынамі. Некалькі зерняачысьцілак ўжо больш году валяюцца на двары паляводсаюзу, а вагон шпагату для вязаньня снапоў папсаваны крысамі. Веялкі ляжаць на складах, у той час, калі калгасы адчуваюць у іх патрэбу. Паляводсаюз ня прыняў ніякіх крокаў да рамонту інвэнтару ў калгасах, матывуючы гэта тым, што «адсутнічае кваліфікаваная сіла».

Аналягічныя адносіны да ўборачнай кампаніі наглядаюцца і ў **саўгасе Пебалава (Рагачэў).** Вакол гэтай важнай кампаніі, піша т. Грахоўскі, саўгасныя арганізацыі не мабілізавалі рабочую масу. Рабочыя нават і ня ведаюць добра знаёньня гэтай кампаніі. Ня прыняты крокі да забясьпячэньня ўборачнай кампаніі рабочай сілай, а таксама не падрыхтаваны склады, тара і г. д.

Б.

ПАСТАНОВА ЦК УсеКП(б) АД 30 ЛІПЕНЯ

Аб рэарганізацыі калгасна-каапэрацыйнай сыстэмы

У выкананьне пастаноў XVI-га партзьезду аб рэарганізацыі калгасна-каапэрацыйнай сыстэмы ЦК УсеКП(б) пастанаўляе:

1. Усё арганізацыйнае і вытворчае кіраўніцтва калгасным будаўніцтвам у раёне сканцэнтраваць у адзіным райкалгасаюзе.

2. Усю работу па вытворчым каапэраваньні і абслугоўваньні індывідуальных сялянскіх гаспадарак, а таксама загатоўча - збытавыя і забясьпячальныя функцыі ў адносінах усіх калгасаў, каапэраваных гаспадарак і індывідуальнікаў сканцэнтраваць у адзіным райкаапсаюзе.

У раёнах з надзвычай нізкім процантам калектывізацыі дапускаць у выглядзе часовага выключэньня стварэньне замест райкалгасаюзаў калгасных аўтаномных сэкцый пры райкаапсаюзах, прычым пытаньне гэта вырашаецца ў кожным паасобным выпадку абласнымі арганізацыямі і зацьвярджаецца саюзам саюзаў і калгасцэнтрам.

3. Райкалгасаюз, разьвіваючы спэцыялізацыю калгасаў у адпаведнасьці з асноўным напрамкам сельскае гаспадаркі ў раёнах, ажыцьцяўляе кіраўніцтва і абслугоўваньне аб'яднаных ім калгасаў таксама і па лініі другарадных для данага раёну галін сельска-гаспадарчага вытворства. Якраз таксама райкаапсаюз, побач з абслугоўваньнем прасьцейшых вытворчых аб'яднаньняў па асноўнай галіне сельскае гаспадаркі раёну, кіруе іх дзейнасьцю і ў адносінах ўсіх другарадных галін сельска-гаспадарчага вытворства. Апарат райкалгасаюзу і райкаапсаюзу павінен быць адпаведна ўкамплектаваны кадрамі спэцыялістых і мець выдаходную гібкасьць, якая забясьпечвае ўсебаковае арганізацыйнае і вытворчае абслугоўваньне сельска-гаспадарчага вытворства данага раёну.

4. Выходзячы з неабходнасьці фарсаваньня разьвіцьця прадукцыйнае жывёлагадоўлі, зьвярнуць асаблівую ўвагу на разгортваньне будаўніцтва райкаапсаюзаў і нізавых вытворчых аб'яднаньняў жывёлагадоўчага напрамку.

5. Скарацьць колькасьць спэцыяльных цэнтраў с.-г. каапэрацыі, пакінуўшы ў абласьцях і краёх ня больш 4-х спэцыяльных саюзаў у адпаведнасьці з асноўнымі тварнымі напрамкамі с.-г. вытворства вобласьці і края.

Прызнаць неабходным стварэньне, апрача ўсесаюзнага Хлебасэнтра, таксама ўсесаюзных цэнтраў жывёлагадоўчай каапэрацыі, сдова-агароднай, ільняной, бульбяной і буйнасьпіх заводзкіх.

Маючы на ўвазе спэцыфічныя, ускладзеныя на насеннаводную каапэрацыю па пашырэньні вытворства чыстагатункованага насеньня для поўнага забясьпячэньня ім ў бліжэйшы час засеўнай плошчы, пакінуць у якасьці паасобна існуючай арганізацыі ўсесаюзны насеннаводны цэнтр і, паводле пастановы Наркамзему Саюзу — у тых абласьцях, дзе гэта будзе прызнана неабходным, — абласныя саюзы насеннаводнай каапэрацыі, якія апіраюцца ў сваёй рабоце на насеннаводныя калгасы і куставыя таварыствы.

7. Для кіраўніцтва дзейнасьцю райкалгасаюзаў арганізаваць рэспубліканскія і абласныя (краявыя) калгасаюзы.

8. Агульнае кіраўніцтва калгасна-каапэрацыйнай сыстэмай аж

Пазыка „Пяцігодка--за 4 гады“

НЕ СУПАКОЙВАЦЦА НА ДАСЯГНУТЫМ

Даць жорсткі адпор клясаваму ворагу, які імкнецца падарваць ход кампаніі

ЗА ДВА ТЫДНІ—МІЛЬЁН РУБЛЁЎ

Члены калгасу „Бальшавік“ першыя ўнесьлі грошы па падпісцы

Папярэднія вынікі падпіскі на пазыку па Менскай акрузе

За два тыдні, паводле далёка няпоўных даных, па Менскай акрузе рэалізавана аблігацый пазыкі «Пяцігодка — за чатыры гады» на суму звыш 1 міл. руб.

Кампанія з посьпехам разгортваецца ў горадзе, аднак, яшчэ ў не выстарчальна баявых тэмпах. Асабліва слаба — на вёсцы.

З агульнай сумы падпіскі на г. Менск прыпадае 788 тыс. руб., або 78 проц. усёй падпіскі, рэшта — на раёны акругі.

Падпіска па раёнах сьведчыць аб слабым правядзеньні кампаніі. Падпісваюцца, галоўным чынам, рабочыя, служачыя і калгасьнікі, толькі нязначная частка 1.205 руб. рэалізавана на вольным рынку і 700 руб. сярод сялян-індывідуальнікаў.

Кампанія разьмяшчэньня пазыкі сярод сялян-індывідуальнікаў па ўсіх раёнах, за выключэньнем Халопеніч і Пухавіч яшчэ не распачата. Між тым, на гэты адказны і важны фронт трэба зьвярнуць максымум увагі.

Па АСТРАШЫЦКА-ГАРАДЗЕЦКІМ РАЁНЕ рабочыя і служачыя падпісаліся на 10.000 руб., калгасьнікі на 4.800 руб. Члены калгасу «Бальшавік» ужо ўнесьлі першы ўнос — 292 руб.

Па ПУХАВІЦКІМ РАЁНЕ агульная сума падпіскі 1.235 руб., з іх сярод сялян-індывідуальнікаў — 460 руб. У лік падпіскі ад рабочых ужо паступіла 192 рублі.

Падпіска сярод рабочых і служачых г. ЧЭРВЕНЯ складае 15.000 руб., сярод сялян падпіска яшчэ не пачалася.

Рабочыя і служачыя ГОР. БАРЫСАВА ахоплены падпіскай на 113.000 руб. Падпіска сярод сялян таксама не пачалася.

Па ХАЛОПЕНІЦКІМ РАЁНЕ, рабочыя і служачыя падпісаліся на 15.000 руб., саматужнікі на 900 руб., сяляне-індывідуальнікі на 700 р., разам — 18.000 р.

У СЬМІЛАВІЦКІМ РАЁНЕ рабочыя і служачыя падпісаліся на 10.500 р., калгасьнікі на 1.200 руб., разам 11.700 р.

Вельмі слаба праходзіць падпіска па Бягомльскім, Лагойскім, Заслаўскім, Смалявіцкім і Бярэзінскім раёнах.

Паданыя лічбы гавораць, што раёны яшчэ не разварушыліся і не разгарнулі кампанію па рэалізацыі пазыкі.

БІРШТЭЙН.

Раўненьне па электрастанцыі імя Леніна

БАРЫСАЎ. (Наш кар.). Высокая сьвядомасьць рабочых і шырокая растлумачальная кампанія далі вельмі добрыя вынікі падпіскі на пазыку па цэнтральнай электрастанцыі імя Леніна ў г. Нова-Барысаве.

Падпіска павінна была даць 7.000 руб.; за тры дні яна дасягнула 10.200 рублёў. Пазыкай ахвачаны 133 чал. з 160. Наперадзе ідуць машынная заля, кацельны цэх і рамонтная брыгада — 110 проц. зарплаты.

Сьлесар тав. **Львоў**, які атрымлівае 60 руб. у месяц падпісаўся на 300 руб., рабочы-качагар т. **Раманоўскі**, які атрымлівае 97 руб. — падпісаўся на 200 руб.

Рабочыя электрастанцыі імя Леніна выклікаюць усіх рабочых і адміністрацыйна-тэхнічны пэрсанал фабрыкі «Чырвоная Бярэзіна» і «Пралетарская перамога» пасьледаваць іх прыкладу

Падпіска ў саматужных арцелях

Швэйная арцель «Пралетары», у якой працуюць 720 чалавек, падпісалася на 17.331 руб., ці 68 проц. двухтыднёвай зарплаты. Падпісалася 600 чалавек — 83 проц. агульнага ліку.

У арцелі «Уперад» з агульнага ліку 42 рабочых падпісаліся 20 чал., або 47 проц. на суму 1.345 руб. — 62 проц. двухтыднёвага заработку.

Арцель гнутай мэблі «Адзінства» падпісалася на 5.000 руб. пры агульным фондзе зарплаты — 6.500 руб. З 160 чалавек падпісаліся 100.

Арцель «Чырвоны Друк» дала падпіску ў суме 2.061 руб. — 74 проц. двухтыднёвае зарплаты, з 69 рабочых падпісалася 33.

Скура-галянтарэйная арцель «Новы Шлях» у ліку 400 чалавек у поўным складзе падпісалася на пазыку. Сума падпіскі 2.200 руб. — 146 проц. месячнае зарплаты.

Рэалізацыя сярод сялян яшчэ не пачыналася

Менская акруговая камісія садзейнасьці дзяржкрэдыту абсьледвала падрыхтоўку да рэалізацыі пазыкі ў Барысаўскім раёне.

Арганізацыйна-падрыхтоўчая работа была скончана да 15 ліпеня. Па горадзе ўжо рэалізавана каля 100.000 руб. Зусім дрэнна стаіць справа з рэалізацыяй пазыкі сярод сялян-індывідуальнікаў. Яшчэ ні адзін сельсавет раёну не распачаў рэалізацыю. Акрамя, з боку сельсаветаў наглядаюцца нядбайныя адносіны да гэтай справы. Так, напрыклад, Зэмбінскі местачковы сельсавет доўгі час трымаў у шафе агітацыйна-апэрацыйны матар'ял і не разьмяркоўваў яго паміж калектывамі.

Старшыня Зэмбінскага сельсавету ня ведаў, што ён атрымаў матар'ял аб пазыцы. Матар'ял доўгі час ляжаў на стале, паміж іншымі паперамі.

РВК не зьвярнуў на пазыку патрэбнай увагі, калі ня лічыць таго, што праведзена адна інструкцыйная нарада з старшынямі сельсаветаў.

Дрэнна стаіць справа з правядзеньнем растлумачальнай работы па абмене. Трэба, каб райвыканком неадкладна кінуў усе сілы крэдытных установаў раёну на вёску, каб прафарганізацыі паслалі ў дапамогу сельсаветам рабочыя брыгады. Сельсаветы павінны прыцягнуць да кампаніі ўвесь актыў, асабліва сацыялістычны сэктар вёскі. Ня меншае значэньне мае прыцягненьне да рэалізацыі настаўніцтва раёну.

КІС.

Экспартная праграма павінна быць выканана

Экспарт у БССР па праву зьяўляецца найбольш адказным вучасткам нашай гаспадарчай работы. Плян на 1929-30 год пабудаваны на базе зусім рэальных экспартных магчымасьцяй БССР, намячаў значнае пашырэньне экспартных апэрацый; параўнаўча з папярэднім годам. Гэта экспартная праграма натуральна разьлічана на актыўную работу ўсіх гаспадарчых арганізацый, так, або іначай зьвязаных з экспартам.

Пытаньні экспарту тым больш павінны стаць у цэнтры ўвагі адпаведных арганізацый БССР, калі ўлічыць невыстарчальныя вынікі выкананьня экспартных праграм першага паўгодзьдзя. Між тым, апошнія месяцы ня толькі не далі пералому, а наадварот — навялічваюць небясьпеку зрыву гадавога пляну.

Зусім нездавальняючыя рэзультаты экспарту паказаў чэрвень. У выніку і ўвесь трэці квартал даў значнае недавыкананьне заданьня.

Галоўным чынам ня выканалі пляны Белшчаціна і Лесбел, якія зьяўляюцца галоўнымі экспарцёрамі БССР.

Пры значным недавыкананьні плянаў праходзіць экспарт некаторых артыкулаў, у тым ліку такіх важных на ўмовах БССР, як лесаматар'ялы, запалкі, шкло, крухмал і смалапродукты.

Калі нявызначэньні гэтых артыкулаў і можна часткова тлумачыць прычынамі, так сказаць, «аб'ектыўнага прадаку», дык тым больш прыходзіцца адзначыць зусім дрэнную работу экспартуючых арганізацый па вывазе іншых тавараў.

А аб'ектыўныя ўмовы для гэтага меліся і нават хусім нядрэнныя. Вялікі па разьмерах забой жывёлы, які рабіўся ў БССР зімой і ў пачатку вясны, у значнай ступені павялічыў базу для збору другарадных экспартных тавараў (шчаціна, воўна, кіпсырэц) і, у прыватнасьці ўцілю (косьці, рогі, капыты і адходы) і экспарт гэтых прадуктаў, здавалася-б павінен быў хаця і ў некатарай ступені кампэнсаваць недавыкананьне пляну па асноўных пунктах.

На справе, аднак, аказалася, што экспарт і гэтых тавараў праходзіць далёка нездавальняюча, бо экспартуючыя арганізацыі яшчэ і да гэтага часу не зразумелі ўсёй важнасьці пашырэньня экспарту другарадных відаў сырцу.

Грамадзкія арганізацыі за апошні час шмат паслабілі сваю ўвагу да гэтага надзвычайна важнага пытаньня. Камісіі садзейнічаньня экспарту нічога ня робяць. Нават камсамольскія і піянэрскія арганізацыі, якія ў справе заготоўкі ўцілю і інш. другарадных экспартных тавараў маглі-б адыграць вялікую ролю,—за апошні час не праяўляюць ніякай дзейнасьці.

Самі-ж заготоўчыя арганізацыі, без дапамогі грамадзкасьці, відома, ня могуць справіцца з гэтай задачай..

Заготоўкі ўцільсырцу, як відома, прэміруюцца прамтаварамі. Здавалася-б, што асартымэнт гэтых тавараў на кошце павінен быў-бы адпавядаць аб'ектам заготоўкі. Між тым, у многіх выпадках у распараджэньні заготоўчых арганізацый ёсьць фонды тавараў, якія ня могуць быць скарыстаны для прэміраваньня здатнымі дробных партый другарадных відаў сырцу—вазняныя хусткі коштам ад 3 да 5 руб. і г. д. Больш танных жа прамтавараў, як іголкі, ніткі, гузікі і г. д. у заготоўшчыкаў зусім няма.

Не арганізавана работа і на заготоўчых пунктах па зборы экспартных тавараў. Як правіла, у кожным пункце ёсьць толькі па адным чалавеку, які адначасова зьяўляецца разьязджаючым агентам. Частыя разьезды апошняга выклікаюць патрэбнасьць закрываць пункт.

Зусім не наладжаны абор і заготоўка ўцілю і інш. экспартных тавараў у саўгасах і калгасах. Вылучаныя для гэтай работы асобы ў большасьці выпадкаў нічога ня робяць.

Усё гэта гаворыць аб тым, што ў адносінах экспарту беларускімі арганізацыямі далёка не скарыстаны ўсе наяўныя магчымасьці і што тут патрэбен безадкладны і рашучы пералом.

ВАР.

Рэдакцыя часопісі «Беларуская Работніца і Сялянка»

— скліканє —

4-га жніўня а 7-ай гадзіне вечару ў памяшканьні рэдакцыі (вул. К. Маркса, 14, пакой 13)

нараду таварышоў-вылучаных райкомамі КП(б)Б.

Выклікаюцца па Кастрычніцкім раёне:
Пэўзнэр (Саюзкожа), Сьлесар (абутковая фабрыка), Шарэйка (чыг.) Точна (чыг).

Па Фрунзаўскім раёне:
Этэвіч (Ахматмлад), Гітліна, Гутман (школа краўцоў), Шустэр (ф-ка Кастрычнік). Белаўская (футравая фабрыка).

МЕНСК

Дэлегацыя Польскай Рэспублікі ў Менску

Пазаўчора ў Менску праездам у Ленінград застанавілася дэлегацыя Польскай рэспублікі.

У склад дэлегацыі ўваходзяць прадстаўнікі міністэрства асьветы п. Мар'ян Фальскі, прадстаўнік гапоўнага статыстычнага кіраўніцтва Польскай рэспублікі дырэктар п. Крэйсьлер, п. Стэфанія Семпелоўская і доктар п. Гансяроўская.

Дэлегаты разам з Упаўнаважаным Народнага Камісарыяту Замежных Спраў т. Ульпянавым наведалі Усебеларускую выстаўку сельскай гаспадаркі і прамысловасьці, Дзяржаўную Бібліятэку, новае памяшканьне, якое будуецца для Дзяржаўнай Бібліятэкі, а таксама Унівэрсытэцкі гарадок.

Увечары для дэлегацыі ў упаўнаважанага Народнага Камісарыяту Замежных Спраў тав. Ульпянава адбыўся банкет, на якім прысутнічалі ўсе прыехаўшыя дэлегаты Польскай рэспублікі, а таксама кіраўнік Генэральнага Консульства Польскай рэспублікі ў Менску п. Забела, намесьнік рэктара Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту акадэмік Вальфсон і адказныя супрацоўнікі Польскага Генэральнага Консульства і Народнага Камісарыяту Замежных Спраў.

2-га жніўня дэлегацыя выехала ў Ленінград на Ўсесаюзную Пэдагагічную Выстаўку.

Парадак прыёму на работу вычышчаных з савецкага апарату

Калегія НК РСІ абмеркавала пытаньне аб парадку прыёму на работу ва ўстановы і прадпрыемствы асоб, зьнятых з работы па чыстцы савецкага апарату.

Калегія адзначыла, што ёсьць рад выпадкаў, калі асобы, якія па пастанове камісіі павінны быць вычышчаны, застаюцца на рабоце ў тых-жа установах і на тых жа пасадах, з якіх яны павінны быць зьняты, або прымаюцца на работу на пасады, на якіх ім забаронена працаваць.

Калегія катэгарычна запрапанавала ўсім кіраўніком установаў, пад іх асабістую адказнасьць, у 5-цідзённы тэрмін праверыць і выканаць пастановы камісій, па чыстцы, калі яны зацьвярджаны цэнтральнай і акруговымі камісіямі.

Кіраўніком установаў катэгарычна забаронена прымаць на работу асоб, зьнятых па чыстцы з забаронай займаць адпаведныя пасады ў савецкіх установах.

Органы біржы працы пры пасылцы на работу асоб, зьнятых з работы пры чыстцы савецкага апарату, павінны строга кіравацца пастановамі камісій наконт пасылкі вычышчаных. Пры пасылцы і прыёме на работу біржы павінны абавязкова патрабаваць копію працоўнага сьпісу, дзе павінна быць занесена пастанова камісіі па чыстцы.

Акруговым РСІ, а пасьля іх ліквідацыі раённым РСІ прапанавана сачыць за выкананьнем гэтай пастановы і вінаватых у парушэньні яе прыцягваць да суровай адказнасьці.

„Кругасьветныя“ махляры

Перад турызмам у нашым краі пастаўлены вялікія задачы. Але нашы арганізацыі вельмі мала ўвагі аддаюць гэтай справе.

Няма кіраўніцтва экскурсіямі і турызмам працоўных. Гэтым карыстаюцца махляры ўсякага роду, якія шукаюць лёгкіх заработкаў.

13-га ліпеня ў Воршы затрыманы пешаход Струкаў. Ён выйшаў з Вышняга Валачка, прайшоў, як пісалі газэты, Паўночны Каўказ, Крым, Украіну, частку РСФСР, БССР. Рад газэт Каўказу і Украіны далі яму пырокую рэкламу. Пасьля затрыманьня яго выявілася, што Струкаў і яго кампаньён Кульманскі зусім не хадзілі пехатою, а езьдзілі на чыгунцы, атрымлівалі грошы, а ў некаторых мясцох рабілі інфармацыю аб сваіх паездках.

Апісваць усе месцы, куды езьдзіў Струкаў, ня трэба. Факт той, што ў паларожнай кнізе Струкава ёсьць дзесяткі пячатак розных устаноў. На жаль, у кнізе ня відаць, што Струкаў і яго кампаньён сядзелі ў Чарнігаве ў напраўчым доме за хуліганства. Кульманскі — былы бандыт, які вылаваў у часе акупацыі камуністых. Разам з ім Струкаў, пад выглядам працоўнага турыстага, аб'ехаў рад гарадоў БССР, пакуль ня трапіў у Воршу, дзе скончыў сваё падарожжа.

Цікава, што некаторыя нашы арганізацыі ніяк не маглі зразумець, што прайсьці за два дні пехатою з Казлова ў Варонеж, з Бахмача ў Гомель даволі ніяжка. Нікому і ў галаву ня прыйшло, што «турыстыя» проста ашукваюць.

Грошы, атрыманыя ад розных арганізацый, яны прапілі. У Воршы ім далі 160 руб., а колькі, такіх гарадоў як Ворша? Авантурыстыя наведалі каля 200 месц і ўсюды ім давалі, давалі значныя сумы на... вывучэньне эканомікі і быту.

Ліст «турыстага» Кульманскага вельмі нагадвае славуты ліст Хлестакова да свайго прыяцеля Трапічкіна: «Штодзень я зьпіваю літр гарэлкі. Зарабляю ня менш 25 руб., але не хапае. Вось, дарагі таварыш, якую я атрымаў пасаду. Грошы даюць усе, так што не пасьпяваеш прапіваць».

Што адважуць на гэты ліст нашы даверлівыя савецкія «гарадничыя» і Ліпкіны-Цыпкіны»?

ЗЗЛЮТКІН.

На дапамогу дзецям беднаты

(Што ўхваліў прэзыдыум ЦВК і СНК БССР)

— У мэтах выяўленьня дзяцей рабочых і членаў прафсаюзаў, якія з наступнага навучальнага году надлягаюць абавязковасьці навучаньня ў 5 групе працоўнай школы,—прэзыдыум ЦВК і СНК БССР прапанавалі зрабіць да пачатку новага навучальнага году дакладны вучот гэтых дзяцей і папярэдзіць іх і бацькоў, што ў наступным навучальным годзе гэтыя дзеці абавязкова павінны вучыцца ў 5 групе працоўнай школы.

Колькасьць вучняў у школе значна павялічыцца, галоўным чынам за лік дзяцей бяднейшай часткі насельніцтва горада і вёскі. Трэба дапамагаць дзецям і ў гэтую справу трэба ўцягнуць усе грамадзкія, гаспадарчыя арганізацыі.

— Для правільнага скарыстаньня бюджэтных сродкаў па дапамогу дзецям беднаты, прыцягненьня да дапамогі дзецям беднаты сродкаў насельніцтва і нагул для паляпшэньня матар'яльнага стану школ, прэзыдыум ЦВК і СНК прапануе органам Наркамасьветы на месцах, сельскім, местачковым і гарадзкім саветам ужыць захады для ўзмацненьня работы існуючых ужо камітэтаў садзейнасьці школе і арганізаваць такія камітэты там, дзе іх яшчэ дагэтуль няма.

Прапанавана каапэрацыйным арганізацыям на мясцох без перашкод і своячасова адпускаць камітэтам садзейнасьці школе рочы, патрэбныя для аказаньня дапамогі дзецям беднаты: мануфактуру, гатовую вопратку, цукар для гарачых сьнеданьняў і г. д.

Народнаму Камісарыяту Фінансаў, разам з Наркамасьветы даручана абмеркаваць пытаньне аб магчымасьці ўнясеньня ў мясцовыя каштарысы данага году сродкаў на адкрыцьцё новых школьных камплектаў у наступным навучальным годзе, каб даць магчымасьць новым школам адкрывацца з пачатку навучальнага году.

Прэзыдыум ЦВК і СНК адзначаючы дрэнны тэхнічны нагляд за пабудовай школьных будынкаў, з прычыны чаго сродкі на школьнае будаўніцтва часта выкарыстоўваецца непрадукцыйна,—прапануе акруговым выканаўчым камітэтам у бягучым сэзоне ўжыць усе захады для ліквідацыі гэтага прарыву.

Прэзыдыум ЦВК і СНК ухваліў павялічыць з наступнага навучальнага году ў педтэхнікумах процант стыпэндыятаў, і давесьці разьмер стыпэндый да процанту стыпэндыятаў і разьмеру стыпэндый у індыструяльных тэхнікумах.

Сенажаць не адведзена

ВОРША. У Крупскім раёне да сёньняшняга дня ня скончаны поўнасьцю адвод сенажаці. Гэта абураючае галавацяпства, награжае сарваць уборачную кампанію. У вёсцы **Ігрушцы**, напрыклад, сенажаць да гэтага часу не адведзена ні калгасу, ні індывідуальным бяднацка-серадняцкім гаспадаркам. Каморнік Пятроў, які прыехаў з раёну, нават ня прыступіў да адводу сенажаці.

ВЯСКОВЫ.

Ветэрынарныя ўрачы не дапамагаюць

У калгасе «Пралетарская Рэспубліка» (Быхаўскі раён) за апошні час пачала хварэць жывёла. Аб гэтым даводзілася да ведама ветэрынарных урачоў, якія дагэтуль ніяк ніякіх мер дапамогі ня прынялі. Жывёлавод адмовіўся ехаць у калгас, матывуючы тым, што дарога вельмі кепская. А жывёла, тым часам, хварэе. Райкалгасаюз павінен неадкладна прыняць належныя меры да такіх адносін да справы з боку жывёлаводаў.

Сямёнаў.

КАСТРЫЧНІЦКІ РК КП(б)Б

склікае 5-га жніўня г. г., а 6 гадз. веч. у клюбе Леніна (ст. Менск—пас.)

ПАШЫРАНЫ ПЛЕНУМ РК.

ПАРАДАК ДНЯ:
1. Вынікі выкананьня прамфінпляну па раёне;
2. Папярэднія вынікі аб перавыбарах фабкомаў;
3. Вынікі пераходу на 7 г. дзень па прадпрыемствах раёну.

На пленум павінны зьявіцца члены РК у абавязковым парадку і без спазьненьня, усе сакратары парткалектываў, ячэек і дэх. ячэек, старшыні ФЗМК, старшыні рэдкалегій насьценгазэт, дырэктары прадпрыемстваў і кіраўнікі ўстаноў—партыйцы.

З лістоў рабселькораў

БЯСПРЫТУЛЬНЫ САЎГАС

Прыгарадныя саўгасы ў сэнсе рабочага забесьпячэньня павінны адыграць вялікую ролю. Ня гледзячы на гэта МЦРК мала зьвяртае ўвагі на прыгарадны саўгас «Вольная Праца».

За апошні час па саўгасе «Вольная Праца» гаспадарчы дагляд запяпаў. Адсутнічаюць работнікі, якія-б непасрэдна адказвалі за тую ці іншую частку маемасьці.

Саўгас мае да 550 галоў жывёлы, але дагляд за апошнімі вельмі дрэнны. 4-га ліпеня загналі стада на канюшыну, і 8 кароў пераеліся і ледзь ня здохлі. Адна карова ўсё-ж здохла. Гэты ўрок ня спужаў кіраўнікоў саўгасу.

Пасьля 12-цідзённага тэрміну зноў паўтараецца тая самая гісторыя, але з больш горшымі вынікамі. З лепшых каровы здохлі.

У сельска-гаспадарчым аддзеле МЦРК не рэагавалі на гэтыя шкодныя зьявішчы.

РСІ павінна тэрміновa заняцца гэтай справай.

Саўгасьнік.

УБОРКА ПРАХОДЗІЦЬ ПАСЬПЯХОВА

У калгасах **Сьмілаўшчыны** (Меншчына) уборка праходзіць на ўдарнаму. Да 1-га жніўня ўборка жыта як у калгасе імя **16 партызан**, так і ў іншых амаль што закончана.

Нельга не адзначыць добрыя да работы адносіны калгасьнікаў. Усе, як адзін, зьяўляюцца на работу своячасова. Ударныя брыгады працуюць сапраўды па ўдарнаму.

Саўгасы таксама дапамагаюць ва ўборцы калгасам.

Лявіцкі.

БЕЗГАСПАДАРЧАСЬЦЬ

У транспартрэсьце на сёньняшні дзень ёсьць шмат хваравітых зьявішч, якія ў выніку даюць дэфіцыт трэсту. Бываюць выпадкі, калі грузавікі ходзяць ненагружанымі, або ў адно і тое месца пасылаюць некалькі грузавікоў, якія таксама варочаюцца пустымі.

Наглядаюцца злачынныя адносіны да машын з боку некаторых шофэраў. Напрыклад, шофэр **Пшэсьліцкі** на загараднай лініі распаяў усе падшыпнікі, таму што была вывернута трубка, якая падае мэханічна змазку ў падшыпнікі. Пры выезьдзе з гораду ў адной машыне, шофэрам якой зьяўляецца т. **Вяржбіцкі**, было знойдзена адцрацаванае масла і жалезныя апілкі ў карцэры машыны. Ад гэтага мог-бы згарэць дзіфэр і іншыя часткі машыны. Гэта нанесла-б страту каля тысячы руб.

Аб усіх гэтых фактах ведае адміністрацыя і ніякіх мер да злачынцаў ня прымае.

У. Тужыкаў.

НЯМА АХОВЫ ПРАЦЫ

Ванняныя заводы (Бярэзінскі раён) працуюць з вялікімі перабоямі з тае прычыны, што адсутнічаюць склады для ссынкі ванны. Між тым насельніцтва раёну адчувае патрэбу ў ванне, але ніхто не клапаціўся давесьці да іх ведама аб тым, што гэткая маецца на гэтых заводах.

Ахова працы на заводах зусім адсутнічае. Рабочыя, якія падаюць камні ў жорны, працуюць без акуляраў. Ня прымаюцца ніякія меры да папярэджаньня абвалаў. 20-та чэрвеня ад абвалу зямлі ледзь не загінула адна работніца. Два заводы пабудаваныя побач ня маюць ні аднаго громаадводу.

Адміністрацыя і прафсаюзы павінны паклапаціцца, каб зьпішчыць гэтыя недахопы.

Лапіцкі.

«ПАСТАНОВА ЁСЬЦЬ І ДОСЬЦЬ»

Па каштарысе **Калінкавіцкага РВК** павінны быць зьгнаваны сродкі на пабудову лазьні ў г. **Калінкавічы**. Да гэтага часу да будаўніцтва лазьні яшчэ ня прыступілі. Засталося два месяцы да канца будаўнічага сэзону, але ніхто яшчэ ня думае распачынаць работу. У гарсавеце адказваюць **«пастанова аб гэтым ёсьць і досьць»**. Трэба апавядным органам узяцца за будаўніцтва лазьні, бо насельніцтва раёну адчувае вялікую патрэбу ў апошняй.

Д.

НЯ ЯСЬЛІ, А КАЛЕЦТВА

Колкаўскія ясьлі (Капаткевіцкага раёну) працуюць вельмі дрэнна. Загадчык ясьляй т. **Ганцеўскі** зусім ня цікавіцца работай. Дзеці цэлы дзень бегаюць па вуліцы бяз усякага догляду. З гэтай прычыны былі выпадкі калецтва дзяцей. Напрыклад: двое хлопчыкаў гэтымі днямі паабпякалі сабе ногі, адно дзіця разьбіла сабе галаву. Многа можна прывесьці такіх фактаў, якія характарызуюць недапушчальныя адносіны да гэтай работы абслугоўваючага пэрсаналу. Насельніцтва выказвае вялікую нездаволенасьць такімі ясьлямі і ня хоча пасылаць туды сваіх дзяцей.

С. К.

СПЫНІЦЬ ЗАБОЙСТВА МАЛАДНЯКУ

Забойства маладняку ў **Дукорскім** сельсавеце, Сьмілавіцкага раёну ня спыняецца. Гандляры арудуюць ва ўсю і штодзённа зьнішчаюць маладняк. **Дукорскі** сельсавет аб гэтых фактах ведае, але чамусьці не пакланаціўся стрымаць гандляроў.

Лявіцкі.

ПАЛАЖЫЦЬ КАНЕЦ НЯДБАЙНАСЬЦІ Ў БУФЭТАХ

Колькі ўжо разоў пісалі, што буфэты МЦРК слаба абслугоўваюцца, але практычных вынікаў ад гэтага мы яшчэ ня маем. Вось, напрыклад, на **«Эльвадзе»**, дзе працуе тысьча рабочых, буфэт абслугоўвае толькі адзін чалавек. Вязумоўна, што чарга стварацца вялікія, бо адзін чалавек ня ў сілах справіцца. Асабліва становішча нагаршаецца ў зьвязку з тым, што МЦРК заўсёды позьніцца з дастаўкаю прадуктаў у рабочыя буфэты.

Цікава ведаць, калі-ж МЦРК зьпішчыць ўсё гэта.

Хошыцар.

БРЫГАДЫ НА ПАПЕРЫ

Калгас **«Кастрычнік»** арганізаваў ударныя брыгады па ўборцы ўраджаю і правядзеньні асеньняй пасеўнай кампаніі. На жаль, нічога з гэтых брыгад ня выходзіць. З прычыны адсутнасьці ўсялякага кіраўніцтва брыгады разваліваюцца.

Будынкі для хаваньня снапоў і сена не падрыхтаваны. Падрыхтоўка да уборкі фактычна зрываецца. Між тым, «Кастрычнік» мае 768 гэкт. зямлі. Ёсьць пагроза, што сотні гэктараў пасеўнай своячасова ня будуць убраны. Старшыня калгасу, ён-жа сакратар парт'ячэйкі правальвае падрыхтоўку. Калі РВК зацікавіўся становішчам калгасу, дык гэты старшыня пагражаў прадстаўнікам раёнкамкому:

ЗУСІМ НЯ ЦІКАВЯЦЦА

У Дубровенскім раёне вызначаны толькі 2 сьвінных калгасы, але ні адзін з іх дагэтуль не прыступіў да будаўніцтва. Калгас «Чырвоны Май», які знаходзіцца на тэрыторыі агракамбінату, яшчэ не атрымаў ні крэдытаў, ні лесаматар'ялаў. Калгас імя Карла Маркса заключыў умову з Лесбелам на атрыманьне 180 куба-мэтраў лесаматар'ялаў, але ўпоўнаважаны Лесбелу ня выдаў высечанага лесу, як гэта было паказана ва ўмове. Надышоўшае зямляўпарадкаваньне калгасу і ўборка сена зусім сарвалі вывазку лесу.

РВК і райвыканкомы сьвінных гаспадарак зусім ня цікавяцца. Праўільнае райкамкомы заюзу нават ня ведае, дзе вызначана будаўніцтва бэконных мяжнікаў і што там робіцца.

К.

ПАВЕДАМЛЕНЬНІ

СЁНЬНЯ, 3 жніўня

Дом Асьветы. 3 жніўня аднаўляюцца заняткі спартыўнага гуртка: піянэрскі з 5 гадз. і дарослых—з 7 гадз.

ЗАЎТРА, 4 жніўня

Дом Асьветы. Адбудзецца вайсковая стральба ў Доме Чырвонай арміі. Яўка ўсіх камсамольцаў яч. працасьветы абавязкова. Збор а 7 г. веч. у Доме Асьветы.

Сад Асьветы. Дармовы літаратурны канцэрт Піка Чуткага. Білеты ў канцылярыі Дому Асьветы з 11-2 і з 6-10 г. у выпадку дрэннага надвор'я канцэрт перанясіцца ў дом.

Культпроп Мен. АК КП(б)Б. Менавыканкам СВБ паведамляе, што а 7 гадз. веч. у памяш. 6 школы адбудзецца нарада актыву ячэек саюзу ваяўнічых бязбожнікаў антыканфесійнай сэкцыі гарсавету СВБ: 33-й і 6-й школ, польпэдтэхнікуму і польклюбу. Яўка абавязкова.

Час. вык. абав. адказ. рэдактара А. МІТЛІН.

БЕЛДЗЯРЖКІНО

даводзіць да ведама ўсіх паступаючых у Масноўскі Дзяржаўны Інстытут Кінематаграфіі і Ленінградзкі фота-кіно-тэхнікум, што прыём заяў у БДКіно

працягнут да 10-га жніўня

— уключна —

Прыём заяў утвараецца на факультэты:
1. Рэжысэрскі
2. Апэратарскі
3. Сцэнарны і аддзяленьні лябараторнае, асьвяцілёцелаў і акторскае

Кожны паступаючы ў заяве павінен дакладна паказаць на які факультэт ці аддзяленьне ён паступае.

Белдзяржкіно

Фабрыка імя Крупскай **КУПЛЯЕ** зрубы для пабудоў

Прапановы прымаюцца да 10 жніўня па адрасе: Менск, 3 карчмы

Дырэкцыя

БЕЛДЗЯРЖКІНО

даводзіць да ведама, што 3-га жніўня г. г.

АДКРЫВАЕЦЦА

ВЫСТАВКА прэміяваных праектаў

будынку кіно і тэатру ў гор. Воршы

Выстаўка адбудзецца ў актавай залі Менскага Політэхнікуму на працягу трох дзён (3, 4 і 5-га жніўня) і будзе адчынена ў гэтыя дні з 12 г. да 3-х гадзіны і з 5 г. да 9 г. веч.

Белдзяржкіно

БЕЛАРУСКІ РАДЫЁ-ЦЭНТР

абвяшчае

КОНКУРСНЫ ПРЫЁМ ДЫКТАРОЎ

на менскую радыё-вяшчальную станцыю імя СНК БССР

Умовы: элементарна-палітычная пісьменнасьць, добрае веданьне беларускай мовы, уменьне добра чытаць на друкаваным і пісаным на бел. мове.

Асобы, якія жадаюць паступіць у якасьці дыктароў, павінны падаць не пазьней 12 жніўня г. г. заяву ў Безрадыёэнтр, Унівэрсытэцкая, 16.

Беларускае Дзяржаўнае Выдавецтва

Да сельска-гаспадарчай выстаўкі

Вышлі з друку і прадаюцца ва ўсіх кнігарнях БДВ і спэжыўкаапэрацыі:

Праф. В. В. ВІНЭР
Паляводзтва БССР на выстаўцы
Стар. 63. Цана 15 к.

М. М. МАКСЫМАЎ
Культура бульбы
Стар. 103. Цана 50 к.

ТЭАТРУ „СІНЯЯ БЛУЗА“ с аюзу сельгаслесрабочых

ПАТРЭБНЫ сіняблузьнікі мужчыны і жанчыны

Прыймовыя іспыты на сцэне Дому Селяніна 2, 3 і 4 жніўня ад 12 да 2 г. Аклад 70 руб.

ПАТРЭБНЫ ПАКОЙ

для прыяжджаючых пэдагогаў Белдзяржмузтэхнікуму

Прапановы накіроўваць на адрасе: Унівэрсытэцкая № 45, т. Пятроў, штодзённа ад 11 да 2 г. дня.

РАГАЧОЎСКАЯ ПРАФТЭХШКОЛА ДРЭВААПРАЦОЎШЧЫКАЎ

ПАВЕДАМЛЯЕ:

ПРЫЁМ У ПРАФШКОЛУ **працягнут да 30 жніўня**

Прымаюцца скончыўшыя сямігодку.

Вучні забясьпечваюцца 60 проц. стыпэндыяй і інтэрнатам.

Для здачы **АБВЕСТКІ** ў газэту **„ЗЬВЯЗДА“** звонкаю па тел. **7-81**

Правілы прыёму ў Барысаўскую прафтэхшколу будаўнікоў

Заявы аб паступленьні прымаюцца з 20 ліпеня да 1-га верасьня. Заявы падаюцца на імя прыймовай камісіі школы.

Да заявы далучаюцца наступныя дакументы:
а) аб узросьце,
б) аб асьвеце,
в) мэдычнае пасьведчаньне аб стане здароўя,
г) даведка аб сацыяльным і матар'яльным становішчы,
д) даведка аб тым, што паступаючы і яго бацькі не пазбаўлены выбарчых правоў,
е) анкета засьведчаная прафсаюзнымі або савецкімі арганізацыямі.

УВАГА: 1) Ніякія копіі дакументаў не прымаюцца.
2) Да заявы неабходна прыклаўшы паштовыя маркі на 20 к. для адказу падаўшу заяў.

Узрост паступаючага павінен быць ня ніжэй 14 гадоў і ня вышэй 18 гадоў.

У прафшколу прымаюцца асобы, якія скончылі 4 групы 7-гадовай школы, або адпаведныя гэтаму курсу іншыя навуч. установы.

Пры Барысаўскай прафшколе існуюць 2 цэхі: каменна-мячны і сталярны.

Курс прафшколы разьлічан на 3 гады.

Перавага пры прыёме даецца дзецям рабочых адпаведных спэцыяльнасьцяй і калгасьнікаў.

Прафтэхшкола.

Беларускаму Політэхнічнаму Інстытуту **ПАТРАБУЮЦЦА:**
1. РАЦЫЯНАЛІЗАТАР (па тэхніцы кіраўніцтва),
2. ЗАГ. БІБЛІЯТЭКАЙ.

Зварачацца па адрасе: Земляробскі зав. № 4.

Даводзіцца да ведама ўсіх арганізацый, што **„Белуціль“** перайшоў на адзіны выхадны дзень з 1-га жніўня г. г. Выхаднымі днямі ўстанаўляюцца: 4, 9, 14, 19, 24, 29.

Белуціль.

Прыём заяў ад паступаючых у пэдтэхнікумы і пэдкурсы БССР

працягнут да 15-га жніўня

Наркамасьветы

ПОЛАЦКАЙ ПРАФШКОЛЕ агнятрывалага будаўніцтва **патрэбен інжынэр-будаўнік-тэхнолёг** на загадваньне майстэрнямі і выкладаньне будаўнічага мастацтва і тэхналёгіі.

Аплата па нагрузцы ад 350 да 450 руб.

Заявы з дакумантамі і водзывамі аб працы накіроўваць на адрасе: г. Полацак, Ленінская, 48. Прафшкола.

Кіно-тэатр **„Культура“** — **С